Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 57 (5431)
СЕРАДА
11
САКАВІКА
1936 г.
Год выдання XIX

ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

АДКРЫЎСЯ XI З'ЕЗД ЛЕНІНСКАГА КОМСАМОЛА СОВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

СФАРМАВАН НОВЫ ЯПОНСКІ ЎРАД.

ВОДГУКІ СУСВЕТНАГА ДРУКУ НА РАЗРЫЎ ГЕРМАНІЯЙ ЛАКАРНСКАГА ДАГАВОРУ.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ: РУШЫЦЬ НАПЕРАД СПРАВУ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ.

АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ ПЛАНЕ РАЗВІЦЦЯ ТОНКАРУННАЙ АЎЦАГАДОЎЛІ І ДАПАМОЗЕ КАЛГАСНІКАМ У НАБЫЦЦІ АВЕЧАК

У АСАБІСТАЕ КАРЫСТАННЕ — ПАСТАНОВА СНК СССР і ЦК ВКП(б).

Т. МАЛІСКАЯ — СТАНОВІШЧА ПРАЦОЎНЫХ ЖАНЧЫН У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПЕРАДАВІКОЎ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ. ПРАМОВЫ ТТ. РАЕЎСКАГА, ЧЫСЛОВА, РУСАКОВІЧА І ЗАЙЦАВА.

75-ГОДДЗЕ СА ДНЯ СМЕРЦІ УКРАІНСКАГА ПАЭТА ТАРАСА ШЭЎЧЭНКА.

Рушыць наперад справу жывёлагадоўлі

Усебеларуская нарада перадавікоў жывёлагадоўлі з усёй нагляднасцю паказала, якія велізарнейшыя магчымасці ёсць у нас для далейшага быстрага ўздыму ўсіх галін жывёлагадоўлі.

Лепшыя конюхі, аўчары, свінары, даяркі, цялятніцы, пастухі, калгасаў і соўгасаў Совецкай Беларусі расказалі на гэтай нарадзе аб каштоўнейшым вопыце сваёй работы, аб сваіх паказальніках, дасягнутых сумленнай упартай працай.

Партыя і совецкі ўрад высока ацэньваюць самаадданую работу ў важнейшай галіне сельскай гаспадаркі — жывёлагадоўлі. Лепшы доказ гэтаму — 39 ордэнаносцаў—перадавікоў жывёлагадоўлі, якімі ганарыцца Совецкая Беларусь, ганарыцца Совецкая краіна.

Жывёлагадоўля БССР, як і жывёлагадоўля ўсяго Совецкага Саюза, ўпэўнена стала на шлях уздыму. Страты, якія былі нанесены жывёлагадоўлі кулацкім шкодніцтвам і агітацыяй за ўбой жывёлы ў першыя гады калгаснага будаўніцтва (а трэба памятаць, што жывёлагадоўчыя галіны сельскай гаспадаркі былі раней больш за ўсё насычаны буйна-кулацкімі элементамі), цяпер паспяхова ліквідуюцца. Аб гэтым ярка сведчыць рост пагалоўя жывёлы, які мы маем за апошнія гады. Калгасныя масы пад кіраўніцтвам партыі з велізарнейшым уздымам бяруцца за развіццё жывёлагадоўлі, якая з'яўляецца адной з галоўнейшых крыніц заможнага калгаснага жыцця.

На XVII з'ездзе партыі таварыш **Сталін** указаў, што «справу жывёлагадоўлі павінны ўзяць у свае рукі ўся партыя, усе нашы работнікі, партыйныя і беспартыйныя». Дзяржаўны план развіцця жывёлагадоўлі стаў магутным вагаром ўздыму гэтай галіны сельскай гаспадаркі.

Кіруючыся ўказаннямі таварыша **Сталіна** аб тым, што «спалучэнне асабістых інтарэсаў калгаснікаў з грамадскімі інтарэсамі калгасаў — вось дзе ключ умацавання калгасаў» партыя паставіла задачу развіцця і агрэмаджанай жывёлагадоўлі, і асабістай жывёлагадоўлі калгаснага двара. Гэтыя задачы з усёй чоткасцю і сілай указаны і сталінскім статутам сельскагаспадарчай арцелі, які з'яўляецца асноўным непарушным законам калгаснага жыцця.

У дзяржаўным плане сяўбы 1936 года велізарнейшая ўвага аддаецца развіццю кармовай базы.

Несумненна, што ёсць усе ўмовы для таго, каб справу жывёлагадоўлі ва ўсіх яе галінах хутчэй рушыць па шляху ўздыму, каб ліквідаваць недахопы, якія яшчэ ёсць у справе развіцця жывёлагадоўлі ў БССР.

Не гледзячы на рост пагалоўя і агульны ўздым жывёлагадоўлі, які мы мелі ў 1935 годзе, мы усё-ж не выканалі дзяржаўны план развіцця жывёлагадоўлі па БССР за 1935 год. Асабліва незадавальняюча абстаіць справа з вырошчваннем і захаваннем ягнят і жарабят. Калі дзяржаўны план вырошчвання цялят за 1935 год выканан на 113 проц., парасят — на 103 проц., то план вырошчвання ягнят выканан усяго на 65 проц., і жарабят — 62 проц.

Гэтыя паказальнікі маюць асаблівае значэнне таму, што конегадоўля і аўцагадоўля—гэта найбольш адстаўшыя і найбольш папярэўшыя страты галіны жывёлагадоўлі па БССР. Таму барацьба за захаванне і вырошчванне ягнят і жарабят маюць выключнае значэнне.

Трэба з усёй праматой сказаць, што і ў 1935 годзе тэмпы росту пагалоўя жывёлы па БССР у асобных галінах яшчэ адстаюць ад тэмпаў росту пагалоўя жывёлы па ўсяму Совецкаму Саюзу. Напрыклад, калі за 1935 год па ўсяму Совецкаму Саюзу на кожныя 100 кабыл было атрымана 32 штукі жарабят, то па БССР у 1935 годзе на кожныя 100 кабыл было атрымана 23 штукі жарабят. Калі па Совецкаму Саюзу на кожную свінаматку было прыплоду 9 парасят у 1935 годзе, то па БССР на кожную свінаматку прыплод складаў 6 парасят.

Рашэнне пленума ЦК КП(б)Б аб тым, што кожны калгас павінен мець свіней і авечак, да гэтага часу яшчэ не выканана.

У асобных раёнах яшчэ няма сапраўднай барацьбы за выкананне сталінскага статута сельскай гаспадаркі ў галіне жывёлагадоўлі, сапраўднай барацьбы за выкананне важнейшай задачы — ліквідацыі бескаровасці калгаснікаў. План надзялення калгаснікаў нёлкамі ў 1935 годзе выканан па БССР усяго на 75,8 проц. Гэта абавязвае партыйныя і совецкія арганізацыі раёнаў, недапушчальна адстаючых у гэтай важнейшай справе, паставіць работу так, каб бескаровасць была ліквідавана па ўсяму раёну і па кожнаму калгасу.

Якія раёны БССР асабліва дрэнна выконваюць указанні партыі, указанні таварыша **Сталіна** аб ліквідацыі бескаровасці? Гэта—раёны Камарынскі, Чырвонаслабодскі, Круглянскі, Дубровенскі, Чэрвеньскі, Крычаўскі і Магілеўскі, якія выканалі план усяго ад 22 да 48 процантаў.

Сёння мы публікуем рашэнне Саюзнага ўрада і Цэнтральнага Камітэта партыі «Аб дзяржаўным плане развіцця тонкарунnай аўцагадоўлі і дапамозе калгаснікам у абзавядзенні авечкамі ў асабістае карыстанне».

Партыя і ўрад Совецкага Саюза аказваюць калгасам і калгаснікам Совецкай Беларусі ў справе развіцця тонкарунnай аўцагадоўлі велізарнейшую дапамогу. Калгасы БССР атрымаюць 6.000 высокапародных бараноў, у тым ліку 1.000 прэкосаў з соўгасаў Азова-Чорнамор'я і 5.000 цыгайскіх бараноў з соўгасаў Крыма. Гэта рашэнне ставіць задачу метызаваць тонкаруннымі баранамі па Беларусі 325.000 авечак і правесці штучнае абсямяненне 28.000 авечак.

Паляпшэнне пароднасці павінна ісці не толькі па калгасных фермах, але і па авечках, якія знаходзяцца ў асабістым карыстанні калгаснікаў. Гэта асабліва павінны ўлічыць тыя работнікі, якія да гэтага часу не вядуць барацьбы за паляпшэнне пароднасці жывёлы, якая знаходзіцца ў асабістым карыстанні калгаснікаў.

Ільготы па пастаўцы воўны для калгасаў і калгаснікаў, разводзячых тонкарунных авечак, робяць аўцагадоўлю буйнейшым вагаром калгаснага заможнага жыцця. Гэта неабходна шырока растлумачыць калгасным масам, каб ужо ў гэтым годзе па-большэвіцку рушыць наперад аўцагадоўлю — гэту найбольш адстаўшую галіну жывёлагадоўлі па БССР. З усёй рашучасцю мы павінны ўзяцца за ўздым і развіццё конегадоўлі.

Маршал Совецкага Саюза тав. **Будзённы**, які прысутнічаў на ўсебеларускай нарадзе перадавікоў жывёлагадоўлі, з усёй сілай падкрэсліў значэнне конегадоўлі і для калгаснай гаспадаркі, і для совецкай краіны, і для ўзмацнення абароназдольнасці.

Усебеларуская нарада перадавікоў жывёлагадоўлі, практычная работа ордэнаносцаў, лепшых спецыялістаў — зоатэхнікаў і ветэрынарных урачоў, загадчыкаў фермамі, конюхаў, аўчароў, даярак, цялятніц, свінароў паказвае, якія велізарнейшыя рэзультаты можна атрымаць, калі любоўна і сумленна адносіцца да сваёй справы. Калі ў сярэднім на кожнай свінаматцы мы маем па БССР 6 парасят прыплоду, то перадавыя калгасныя фермы, перадавыя свінары і свінаркі ў 1935 годзе ад кожнай свінаматкі атрымліваюць па 23—25 штук парасят прыплоду. Калі мы маем у сярэднім на карову 1.100 літраў удою малака, то лепшыя перадавыя даяркі атрымліваюць у сярэднім на карову звыш 3.500 літраў малака. Калі ў сярэднім па БССР ад кожных 100 кабыл атрымана 23 штукі жарабят, то ў перадавых калгасах нашы знатныя конюхі атрымліваюць ад кожных 100 кабыл па 90 жарабят. Калі ў сярэднім ад 100 авечак атрымліваецца 50—55 ягнят, то лепшыя аўчары ад кожных 100 авечак маюць 230—240 ягнят.

Так, як працуюць перадавікі жывёлагадоўлі, могуць і павінны працаваць усе калгаснікі і калгасніцы. Такія рэзультаты, якія атрымліваюць перадавыя калгасы і лепшыя калгасныя фермы, могуць і павінны атрымліваць усе калгасы Совецкай Беларусі. Для гэтага патрэбна адно — зрабіць вопыт перадавікоў здабыткам усіх калгаснікаў і рабочых соўгасаў нашай рэспублікі; усім калгаснікам і калгасніцам, працуючым на важнейшым участку сельскай гаспадаркі — жывёлагадоўлі, адносіцца да справы такжа чэсна, добрасумленна, па-калгаснаму як адносяцца да сваёй справы перадавікі, людзі, атрымаўшыя цяпер за сваю самаадданую работу ордэны — вышэйшую ўзнагароду Совецкага Саюза.

Калі мы гэтага даб'емся, то мы зможам у тры і чатыры разы павысіць выхад прадукцыі і пагалоўе жывёлы, а гэта азначае, у тры і чатыры разы павялічыць колькасць мяса, малака, масла, сала, воўны, павялічыць даходнасць калгасаў і калгаснікаў.

Партыйныя і совецкія арганізацыі ў кожным раёне павінны прыняць неадкладна ўсе меры, каб вопыт перадавікоў, паказальнікі лепшых калгасаў, уменне і любоў да справы знатных людзей жывёлагадоўлі зрабіць здабыткам кожнага калгаса, калгасніка і калгасніцы БССР.

Больш паловы ўсіх дэлегатаў усебеларускай нарады — гэта жанчыны. У развіцці жывёлагадоўлі, як і ў калгаснай рабоце, жанчына з'яўляецца вялікай сілай. Цяпер трэба з яшчэ большай рашучасцю ўзяцца за выкананне указанняў партыі, указанняў таварыша **Сталіна** аб тым, каб пусціць гэту вялікую сілу ў справу, высоўваць наперад жанчыну, дапамагаць ёй, узняць яшчэ вышэй ролю жанчыны-калгасніцы, працуючай у галіне жывёлагадоўлі.

Калі мы ўсе будзем рашуча змагацца за выкананне ўказанняў т. Сталіна, то мы зможам у найкарацейшы тэрмін узняць усю жывёлагадоўлю БССР на высокі ўзровень соцыялістычнай гаспадаркі.

УЧОРА АДКРЫЎСЯ XI З'ЕЗД ЛЕНІНСКАГА КОМСАМОЛА БЕЛАРУСІ

НА АДКРЫЦЦІ З'ЕЗДА

Песні, бадзёрыя, вясёлыя, як нашае радаснае, шчаслівае жыццё, запоўнілі вялікую залу пасяджэнняў Дома ўрада.

Марш «Веселых ребят» змяняецца беларускімі народнымі песнямі, «Амурска-партызанская» песняй «О встречном». У цэнтры залы пад дружныя апладысменты выконваюцца нацыянальныя народныя танцы.

Гэта сабраліся на свой з'езд лепшыя прадстаўнікі самай шчаслівай у свеце моладзі.

Шаўковыя плашчі, бастонавыя касцюмы, здаровыя з усмешкай маладыя твары, вясёлыя песні, жарты, скокі — усё гэта гаворыць, як добра, весела жыць у нашай шчаслівай краіне, жыць у эпоху вялікага Сталіна.

Токар і інжынер, пагранічнік і ўрач, настаўнік і пілот, тэкстыльшчык і калгасны конюх, аграном і студэнт — маладыя стаханаўцы соцыялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі — вось хто запаўняе сёння залу Дома ўрада. У многіх на грудзях ордэны Саюза ССР — вышэйшая ўзнагарода за выдатную працу.

Аб гэтай гераічнай праны тысяч лепшых маладых людзей Совецкай Беларусі, якія самаадданая працуюць на нашых фабрыках і заводах, на калгасных і соўгасных палях, якія стаяць на ахове свяшчэнных граніц вялікай краіны Советаў, якія авалодваюць вышынямі навукі і тэхнікі — гаворыць у сваім уступным слове сакратар ЦК ЛКСМБ тав. **Аўгустайціс**, адкрываючы XI з'езд ленінскага комсамола Совецкай Беларусі.

Ён гаворыць аб беззаветнай адданасці нашай совецкай моладзі партыі **ЛЕНІНА—СТАЛІНА**, справе будаўніцтва сацыялізма.

— Наша пакаленне шчасліва тым, што жыве ў эпоху гіганцкіх творчых работ, у эпоху вялікага **Сталіна**,—гаворыць тав. Аўгустайціс.

Яго словы пакрываюцца бурай апладысментаў. Дэлегаты з'езда, стоячы, вітаюць вялікага правадыра таварыша **СТАЛІНА**. У громе апладысментаў і крыкаў «ура» ў гонар таварыша **СТАЛІНА** адчуваецца бязмежная любоў да таго, хто прывёў нашу краіну да такога шчаслівага жыцця.

І калі тав. Аўгустайціс гаворыць аб перамогах Совецкай Беларусі на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва, перамогах, атрыманых пад кіраўніцтвам ЦК ВКП(б) і асабіста таварыша **СТАЛІНА**, аб кіраўніках ордэнаноснай БССР, аб кіраўніках і арганізатарах гэтых перамог — ЦК КП(б)Б і яго першага сакратара Нікалая Фёдаравіча **Гікало**, зала наладжвае бурную авацыю.

517 дэлегатаў ад 57 тысяч комсамольцаў БССР выбрана на з'езд на раённых і акруговых канферэнцыях комсамола. На з'езд прыбыло 506 дэлегатаў. XI усебеларускі з'езд ленінскага комсамола абвяшчаецца адкрытым.

Пад бурныя апладысменты ў прэзідыум з'езда выбіраюцца тт. **Гікало, Валковіч, Галадзед, Чарвякоў, Убарэвіч, Лепляўскі, Рысін, Лешчынер, Гаўштэйн, Сердзіч, Юнг, Аўгустайціс**, ордэнаносцы — **Досін, Лучкоўскі, Бляхерава, Рэброў, Юдзін, Зямлянскі, Салаўёў, Шульга**, паэты **Александровіч, Купала, Колас**, чырвонафлотцы падшэфнага беларускаму комсамолу лінкора «Парыжская комуна» тт. **Пуга** і **Леншын**, стаханаўкі—члены ЦВК БССР тт. Шыфрына і Норкіна і інш.

Грамам апладысментаў сустракае зала прапанову выбраць у ганаровы прэзідыум палітбюро ЦК ВКП(б), на чале з таварышам **Сталіным**, тт. **Ежова, Гікало, Косарава, Дзімітрава** і **Тэльмана**.

«Няхай жыве лепшы друг моладзі таварыш Сталін».

«Рулявому пролетарскай рэвалюцыі таварышу **СТАЛІНУ** «ура», —урачыстымі воклічамі ў гонар любімага правадыра адказвае з'езд на прапанову паслаць прывітальную тэлеграму таварышу Сталіну.

З'езд пераходзіць да абмеркавання першага пытання парадку дня — даклада ЦК ВЛКСМ.

З дакладам аб рабоце ЦК ВЛКСМ выступіў член бюро ЦК ВЛКСМ т. **Лешчынер**. Комсамол, — гаворыць т. Лешчынер, — ідзе пад кіраўніцтвам партыі у першых радах барацьбітоў за соцыялістычнае пераўтварэнне нашай краіны. У лік ўзнагароджаных вышэйшай узнагародай Саюза ССР лепшыя імёны комсамольцаў, якімі па праву ганарыцца ўвесь ленінскі комуністычны саюз моладзі.

За соцыялістычныя метады работы ўзнагароджаны вышэйшай узнагародай не толькі асобныя комсамольцы, а і цэлыя арганізацыі. За адданую работу на будаўніцтве гідрастанцыі імя Леніна ўзнагароджана Днепрапятроўская арганізацыя комсамола, па ініцыятыве таварыша **Сталіна** ўзнагароджана ордэнам Леніна Маскоўская арганізацыя ВЛКСМ за выдатную работу па пабудове лепшага ў свеце метрапалітэна.

Лік комсамольцаў у прамысловасці з кожным годам павялічваецца. За апошнія пяць год у два разы павялічылася колькасць комсамольцаў у калгасах. Узмацняецца роля комсамола і на культурным фронце. У радах комсамола растуць пісьменнікі, паэты, аграномы, работнікі мастацтва і навукі.

Даклад тав. Лешчынера перарываецца. Пад гукі фанфар у залу ўваходзяць юныя піянеры. Яны прышлі вітаць з'езд ад арміі совецкай дзетвары.

Трыбуну з'езда, усе праходы залы запоўнілі дзеці ў піянерскіх галстуках, з вянкамі на галавах. Пад столлю залы рэе стратастат.

Гэта было незвычайнае прывітанне. Гэта была выдатнейшая дэманстрацыя шчаслівага дзяцінства, створанага партыяй Леніна—Сталіна, створанага любоўю і клопатамі вялікага Сталіна. Маленькі самадзёлаў, розных машын, радыёпрыёмнікаў падпяслі з'езду юныя вынаходцы — выхаванцы дзіцячай тэхнічнай станцыі.

«Я нарадзілася ў 1926 годзе 8 сакавіка ў Міжнародны комуністычны жаночы дзень» — дакладвае з'езду маленькая дзяўчынка. Многія з вас тады ўжо былі комсамольцамі. Мы акцябраты, у нас ёсць усё: і балетны гурток, і кнігі, і цацкі.

Я вучуся на «выдатна», а калі скончу школу, пайду вучыцца на інжынера».

«Мы дзеці, бадзёрасцю, энергіяй багаты.

У нас будуць тысячы будаўнікоў,

тав. Сталін лепшы наш важаты» — хорам падхапляюць піянеры яе выступленне.

Піянеры расказваюць з'езду аб сваёй вучобе, рабоце і адпачынку.

І тут-жа ў песнях, скоках, музыцы, дэкламацыі дэманструюць яны перад з'ездам свае дасягненні, свае таленты.

Песня аб маладосці, якую выконваў дзіцячы джаз НКУС, словы гэтай песні:

«Потому что у нас
Каждый молод сейчас
В нашей юной счастливой
стране»...

асабліва ярка адлюстроўвалі шчаслівую маладосць у нашай краіне.

— У нас ёсць усё: і клубы, і бібліятэкі, і фізкультурныя пляцоўкі. Для нас будуецца палац піянераў і юнакоў. Увесь час на кожным кроку адчуваем мы любоў і вялікія клопаты аб нас партыі і любімага Сталіна. Мы хочам толькі аднаго. Хай часцей заходзяць да нас у школы старэйшыя комсамольцы, стаханаўцы, інжынеры, чырвонаармейцы. Мы просім адкрыць больш клубаў, бібліятэк, дамоў калгасных дзяцей, каб тэхнічнымі і абарончымі гурткамі былі ахоплены ўсе дзеці гораду і вёскі.

Бурнымі апладысментамі праводзіць з'езд шчаслівых дзяцей нашай шчаслівай краіны.

З'езд пасылае прывітальную тэлеграму ордэнаноснаму кіраўніку большэвікоў Совецкай Беларусі тав. **Гікало**.

***

На гэтым канчаецца першае пасяджэнне з'езда. Працяг даклада тав. Лешчынера сёння ў 11 гадзін раніцы ў памяшканні Дома партактыва.

Дэлегаты XI з'езда ЛКСМБ. На здымку: злева направа т. Новікава Н. Л. — інструктар-тэхнолаг электрастанцыі Гомеля, Попова О. Я. — інструктар-пётчык гомельскага аэраклуба.

Фота Я. САЛАВЕЙЧЫКА.

ПЕТРЫКОЎ. СТАРШЫНІ РАЙВЫКАНКОМА ЗАКОРКІНУ, САКРАТАРУ РАЙКОМПАРТА АРАШЧУКУ МАЗЫР. ОРГБЮРО ЦК КП(б)Б АНАНЬЕВУ, ОРГКАМІТЭТУ ЦВК БССР—ДУБІНЕ

Па матэрыялах абследвання Наркамзема, падрыхтоўка да пасоўнай кампаніі ў раёне сарвана, — насенне не засыпана, не ачышчана, некандыцыйнае не абменьваецца ў радзе калгасаў, насенне папсавана, гной на поле не вывозіцца, мінеральныя ўгнаенні ляжаць пад адкосам, дрэнна захоўваюцца ў саміх калгасах; рамонт інвентару ў МТС, а таксама ў калгасах, не закончаны.

Такое становішча в пасевам у бягучым годзе, пасля рашэння ЦК ВКП(б), Соўнаркома Саюза і распубліканскіх партыйных і совецкіх арганізацый, інакш як пра-мым супраціўленнем мерапрыемствам партыі і ўрада ўзняцца ўраджайнасці назваць нельга.

Соўнарком і ЦК КП(б)Б патрабуюць рашучых мерапрыемстваў па паляпшэнню работы па веснавой сяўбе. 20 сакавіка асабіста прыязджайце ў ЦК і СНК з дакладам пра становішча падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

Оргбюро ЦК КП(б)Б і оргкамітэту ЦВК БССР Мазырскай акругі зрабіць адпаведныя вывады ў адносінах іншых раёнаў. Аб прынятых мерах паведамце ЦК, Соўнаркому і Наркамзему.

ГАЛАДЗЕД ГІКАЛО

10.III.1936 г.

Перад ратыфікацыяй французскім сенатам франка-совецкага дагавору

ПАРЫЖ, 10 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе: «Камісія па замежных справах сената абмеркавала даклад Ле-Трокера аб законапраекце, які прыняты палатай дэпутатаў і прадугледжвае ратыфікацыю франка-совецкага дагавору. Даклад прадстаўляе сабой значны дакумент, які змяшчае гістарычны агляд, юрыдычны аналіз і вывады палітычнага парадку. Старшыня камісі Анры Беранжэ ад імя ўсёй камісіі падзякаваў Ле-Трокера за даклад.

Некаторыя члены камісіі, а іменна: Мільеран, Вендэль, Дэльфюс, Бенар, Туньр (якія раней былі супроць дагавору) заявілі, што яны цяпер рашылі галасаваць за ратыфікацыю дагавору ў адказ на правакацыю Германіі, знайшоўшую сваё яркае выражэнне ў парушэнні лакарнскага дагавору. Гэтыя заявы былі сустрэты аднадушнымі апладысментамі. Даклад Ле-Трокера быў прынят амаль аднагалосна сенацкай камісіяй. Абмеркаванне франка-совецкага дагавору ў сенаце адбудзецца 12 сакавіка.

З прычыны дыпламатычнага становішча, створанага дзеяннямі Германіі, дыскусія па пытанню аб ратыфікацыі франка-совецкага дагавору не будзе такой доўгай, як гэта меркавалася раней. Можна не сумнявацца ў тым, што франка-совецкі дагавор будзе ратыфікаваны ў сенаце пераважнай большасцю галасоў».

Заява новага японскага прэм'ера

ТОКІО, 9 сакавіка. (БЕЛТА). Сёння раніцой Хірота ў якасці прэм'ера зрабіў першую заяву. У гэтай заяве ён абмежаваўся ўказаннем, што стварэнне новага ўрада адбывалася ў абстаноўцы «вельмі цяжкага ўнутранага і знешняга становішча Японіі; значыць, кіраванне дзяржаўнымі справамі патрабуе пастаяннай асцярожнасці».

Што датычыць канкрэтнай палітыкі новага ўрада, то Хірота сказаў, што новы габінет «у хуткім часе выпусціць адпаведную заяву». Хірота асобна спыніўся на сваіх перагаворах з генералам Тэрауці і з адміралам Нагано, якія адбыліся перад стварэннем новага ўрада. Ён заявіў: «Перагаворы гэтыя мелі агульны характар, таму закранутыя пытанні, мабыць, не будуць прадметам абмеркавання надыходзячай парламенцкай сесіі». Указаўшы, што «завяршэнне стварэння габінета суправаджалася многімі ўскладненнямі», Хірота запэўніе, што чуткі аб разгалосях паміж ім і морскімі і ваеннымі міністрамі не маюць падставы.

АДЪЕЗД ТАВАРЫША М. М. ЛІТВІНАВА Ў ЖЭНЕВУ

Народны камісар па замежных справах тав. М. М. Літвінаў выехаў у Жэневу для ўдзелу ў рабоце сесіі Совета Лігі нацый.

(БЕЛТА).

Новыя сюрпрызы Гітлера

БЕРЛІН, 9 сакавіка. (БЕЛТА). Як цяпер высвятляецца, Германія мае намер скасаваць яначным парадкам яшчэ рад абмежаванняў, ускладзеных на яе версальскім дагаворам.

Блізкая да Герынга эсенская «Нацыяналь цэйтунг» паведамляе: «Аднаўленне поўнага суверэнітэту імперыі, разумеецца, уключае ў сябе таксама скасаванне астатніх існуючых яшчэ абмежаванняў версальскага дагавору, напрыклад, скасаванне міжнароднай камісіі па германскіх рэках». (Па версальскаму дагавору Эльба, Одэр і некаторыя іншыя рэкі былі інтэрнацыяналізаваны, г. зн. права суднаходства па іх было прадстаўлена і іншым краінам).

ЦАНА ІТАЛЬЯНСКАЙ ДРУЖБЫ

ПАРЫЖ, 9 сакавіка. (БЕЛТА). Згодна вестак вядомага журналіста Пертынакса («Эко дэ Пары»), учора італьянскі пасол паведаміў французскаму міністру замежных спраў Фландэну аб гатоўнасці Італіі падтрымаць Францыю, але пры ўмове, што Італія не будзе спешана ў сваіх дзеяннях у Абісініі. Паводле слоў Пертынакса, Фландэн як быццам згадзіўся на гэту просьбу і абяцаў падтрымаць яе ў перагаворах з Ідэнам.

Сакратару ЦК КП(б)Б таварышу ГІКАЛО

Дарагі, блізкі нам кіраўнік ордэнаноснай Беларускай рэспублікі Нікалай Фёдаравіч Гікало!

Мы, стаханаўцы соцыялістычнай жывёлагадоўлі, вельмі шкадуем, што не маем магчымасці з-за вашай хваробы разам з вамі абмеркаваць на нарадзе пытанне жывёлагадоўлі і шлем вам ад усёй душы наша гарачае большэвіцкае прывітанне.

Запэўніем вас, таварыш Гікало, што пад кіраўніцтвам ЦК большэвікоў Беларусі, на чале з вамі, мы справу соцыялістычнай жывёлагадоўлі разгорнем так, як гэтаму вучыць наш родны бацька вялікі Сталін.

Няхай жыве комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі і яе кіраўнік таварыш **Гікало!**

Няхай жыве правадыр народаў вялікі **Сталін!**

Па даручэнню ўдзельнікаў нарады

ПРЭЗІДЫУМ.

У ЦК ВКП(б)

Аб рэдактару „Ленинградской правды" тав. БЕЛІЦКІМ

ЦК ВКП(б) пастанавіў: за дапушчэнне раду грубых памылак, якія выразіліся ў неаднаразовым апублікаванні неправерэных, а часамі і проста скажаючых факты замежных інфармацыйных матэрыялаў,—зняць з пасады рэдактара «Ленинградской правды» тав. Беліцкага і абвясціць яму суровую вымову. (БЕЛТА).

АДКРЫЛАСЯ ГАЛІННАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БССР

Учора вечарам у Менску, у Доме працы адкрылася галінная канферэнцыя швэйнай прамысловасці БССР. На канферэнцыю прыехала 90 дэлегатаў, сярод іх 20 стаханаўцаў. Аб рэалізацыі рашэнняў снежаньскага пленума ЦК ВКП(б) і студзеньскага пленума ЦК КП(б)Б зрабіў даклад дырэктар Белшвэйтрэста тав. **Карасік**.

Учора-ж выступілі ў спрэчках лепшы стаханавец швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» тав. **Гапоненка**, начальнік касцюмнага цэха вішэўскай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» тав. **Даніман**, тав. **Маршак** (ЦП саюза швэйнікаў), стаханаўка швэйнай фабрыкі «Профінтэрн» **Гантман**, начальнік закройнага цэха гэтай-жа фабрыкі т. **Кімельман** і інш.

Аб дзяржаўным плане развіцця тонкаруннай аўцагадоўлі і дапамозе калгаснікам у набыцці авечак у асабістае карыстанне

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ВКП(б)

Совет Народных Камісараў СССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) **пастанаўляюць:**

I

АБ ПЛАНЕ РАЗВІЦЦЯ ТОНКАРУННАЙ АЎЦАГАДОЎЛІ

1. Правесці ў 1936 годзе метызацыю тонкарунными баранамі 11 мільёнаў 130 тыс. авечак, у тым ліку: **не менш 4/5 грубашэрсных авечак** як у калгасах, так і ў калгаснікаў і аднаасобнікаў па Азова-Чорнаморскаму і Паўночна-Каўказскаму краях (за выключэннем авечак, якія знаходзяцца ў горных раёнах), па Саратаўскаму, Сталінградскаму (за выключэннем Калмыцкай АССР), Куйбышаўскаму краях; **не менш 2/3 грубашэрсных авечак** Чэлябінскай, Омскай, Курскай, Варонежскай і Оранбургскай абласцях, Башкірыі, Татарыі і Украіне; **не менш паловы грубашэрсных авечак** па Заходне-Сібірскаму і Краснаярскаму краях і Казахскай АССР.

2. Для ажыццяўлення зацверджанага гэтай пастановай плана метызацыі:

а) абавязаць соўгасы НКСоўгасаў і Наркамзема СССР прадаць **калгасам** да 25 чэрвеня 1936 года 111.500 тонкарунных бараноў, у тым ліку 41.000 бараноў пароды «рамбулье», 28.500 бараноў пароды «прэкос», 20.000 бараноў мясцовых каўказскіх мерыносаў і 22.000 бараноў цыгайскіх, у тым ліку:

	Рамбулье	Прэкос	Мясцовыя мерыносы	Цыгайскія	Усяго
Соўгасы Наркомсоўгасаў	36.000	22.700	18.000	17.400	94.100
Соўгасы Наркамзема СССР	3.200	4.000	600	3.400	11.200
Соўгасы іншых ведамстваў	1.800	1.800	1.400	1.200	6.200

б) Устанавіць, што соўгасы Наркомсоўгасаў і Наркамзема СССР адпускаюць бараноў «рамбулье» і «прэкос» па цане 200—250 руб., мясцовых мерыносаў па цане 150—180 руб. і цыгайскіх па цане 100—120 руб. за барана з надбаўкай у 40 руб. у тых выпадках, калі баран будзе праданы нястрыжаным.

в) Абавязаць Сельгасбанк прадаставіць калгасам на куплю тонкарунных бараноў ад соўгасаў трохгадовы крэдыт у суме 36 мільёнаў рублёў, у тым ліку 20 млн. рублёў за кошт адпушчаных Наркамзему крэдытаў на куплю ў 1936 годзе племянной жывёлы і 16 млн. за кошт дадатковага крэдыту.

г) Абавязаць Наркамзем неадкладна арганізаваць праверку і прыёмку прызначаных для продажу калгасам бараноў.

Забараніць Наркомсоўгасаў прадаваць, а Наркамзему прымаць бараноў хворых брупэлезам і каростай.

3. Абавязаць Наркомсоўгасаў выгадаваць і падрыхтаваць да продажу калгасам у 1937 годзе не менш 145.000 чыстапародных тонкарунных бараноў, у тым ліку «рамбулье» — 50.000, «прэкос» — 25.000, мясцовых мерыносаў — 35.000 і цыгайскіх — 35.000 галоў.

4. Забараніць соўгасам і калгасам рабіць кастрацыю племянных бараноў, годных для мэт метызацыі. Абавязаць пракуратуру СССР прыцягваць вінаватых у кастрацыі племянных бараноў да крымінальнай адказнасці, як за наўмыснае калецтва жывёлы з мэтай перашкоджання ўздыму сельскай гаспадаркі.

II

АБ ПРЫМЯНЕННІ МЕТАДУ ШТУЧНАГА АБСЕМЯНЕННЯ ДЛЯ ПАСКАРЭННЯ РАЗВЯДЗЕННЯ ТОНКАРУННАЙ АЎЦАГАДОЎЛІ

1. Абавязаць Наркамзем СССР арганізаваць у 1936 годзе штучнае абсямяненне ад лепшых пародтонкарунных бараноў «рамбулье» і «прэкос» не менш 6 мільёнаў 100 тысяч аўцаматак.

2. Арганізаваць да 1 ліпеня 1936 г. 5.000 новых пунктаў штучнага абсямянення і падрыхтаваць для іх 7.480 работнікаў па штучнаму абсямяненню і 2.012 інструктароў.

3. Адпусціць для арганізацыі і абсталявання пунктаў штучнага абсямянення і падрыхтоўкі кадраў для іх 8,5 млн. руб., у тым ліку 3,5 млн. руб. са сродкаў Наркамзема СССР і 5 млн. руб. з рэзервовага фонду Саўнаркома СССР і на будаўніцтва памяшканняў найбольш буйных пунктаў дадаткова з дзяржаўнага бюджэту 4 мільёны рублёў.

4. Абавязаць Наркамцяжпром здаць Наркамзему СССР для пунктаў штучнага абсямянення ў 1936 годзе 5 тыс. мікраскопаў (трэст ВООМТ) і 80 тыс. мікрашпрыцаў (трэст Саюзэлаборгэктыў), у тым ліку да 1 ліпеня 1936 г. 8 тыс. мікраскопаў і 40 тыс. мікрашпрыцаў.

5. Устанавіць, што за пакрыццё племянными баранамі і штучнае абсямяненне авечак, належачых калгаснікам, плата не бярэцца ў тых выпадках, калі племянны баран належыць свайму калгасу; за пакрыццё авечак племянным бараном, належачым іншаму калгасу, калгасам — уласнікам барана, бярэцца плата ў памеры 20 кап.

6. Устанавіць, што за кожную авечку, пакрытую тонкарунным бараном, калгасу для прэміравання работнікаў пункта штучнага абсямянення выдаецца дзяржаўная прэмія ў памеры 50 кап. з кожнай авечкі.

Адпусціць Наркамзему СССР з рэзервовага фонда СНК СССР 3 мільёны 50 тысяч рублёў на прэміраванне работнікаў калгасаў па штучнаму абсямяненню.

III

АБ ДЗЯРЖАЎНАЙ ДАПАМОЗЕ КАЛГАСНІКАМ У НАБЫЦЦІ АВЕЧАК У АСАБІСТАЕ КАРЫСТАННЕ

1. Прадаць у 1936 годзе на ільготных умовах 4 мільёны 76 тыс. авечак калгаснікам, якія набываюць, у адпаведнасці з прыкладным статутам сельскагаспадарчай арцелі, авечкі ў асабістае карыстанне калгасніка двара, у тым ліку з калгасных аўцагадоўчых ферм 3 млн. і 1 мільён 76 тыс. з соўгасаў, у тым ліку 940 тысяч з соўгасаў Наркомсоўгасаў.

2 Абавязаць Наркамзем СССР па калгасных таварных фермах, а Наркомсоўгасаў па соўгасах, вылучыць для продажу калгаснікам аусім здаровых авечак і ярак і арганізаваць продаж іх праз праўленні адпаведных калгасаў—калгаснікам.

3. Устанавіць, што продаж авечак калгаснікам праводзіцца па дзяржаўных закупачных цэнах.

4. Устанавіць, што ў тых выпадках, калі калгасніку прадаецца авечка або ярка з фермы свайго калгаса, аплата авечкі робіцца або наяўнымі, або авечка перадаецца калгасніку ў кошт яго даходу па працаднях. У тых выпадках, калі калгасніку прадаецца авечка або ярка з іншага калгаса або соўгаса, калгаснік, калі ў яго ёсць магчымасць, расплачваецца за яе неадкладна, або атрымлівае на куплю авечкі крэдыт ад Сельгасбанка да лістапада 1936 года.

5. Абавязаць Сельгасбанк аказаць калгаснікам кароткатэрміновы крэдыт для куплі авечак у асабістае карыстанне калгаснага двара ў памеры 25 млн. руб. з пагашэннем у лістападзе месяцы 1936 года.

IV

АБ ІЛЬГОТАХ ПА ПАСТАЎКАХ ВОЎНЫ КАЛГАСАМ І КАЛГАСНІКАМ, ЯКІЯ НАБЫВАЮЦЬ І РАЗВОДЗЯЦЬ ТОНКАРУННЫХ АВЕЧАК

1. Знізіць норму здачы воўны з тонкарунных авечак, устанавіўшы, што калгасы і калгаснікі здаюць дзяржаве: па авечках пароды **«рамбулье»**, якія даюць звычайна 5—6 кілограм настрыгу воўны — **3,5 кілограмы**, па авечках пароды **«прэкос»**, якія даюць звычайна 4—4½ кілограма настрыгу воўны — **2,8 кгр.**, па **мясцовых мерыносах**, якія даюць звычайна 5—5½ кілограм настрыгу воўны — **3,2 кгр.** і па **цыгайскіх** авечках, якія даюць звычайна 3—4 кілограмы настрыгу воўны — **2,2 кгр.** воўны з адной авечкі.

2. Прыраўнаць з 1936 года ўсіх метысаў першых трох пакаленняў (генерацый) па здачы воўны ў парадку абавязковай пастаўкі воўны дзяржаве да грубашэрсных авечак.

3. Устанавіць наступныя ільготы калгаснікам, маючым у асабістым карыстанні тонкарунных і паўгрубашэрсных авечак:

пры наяўнасці ў асабістым карыстанні калгаснага двара адной авечкі здача воўны праводзіцца ў памеры адной трэці дзеючай нормы;

пры наяўнасці ў гаспадарцы двух авечак здача воўны дзяржаве праводзіцца з адной галавы;

пры наяўнасці ў гаспадарцы трох ці чатырох авечак здача воўны праводзіцца з двух галоў;

пры наяўнасці ў гаспадарцы пяці або шасці авечак — здача воўны праводзіцца з трох галоў;

пры наяўнасці ў гаспадарцы сямі або васьмі авечак здача воўны праводзіцца з чатырох галоў;

пры наяўнасці ў гаспадарцы дзевяці або дзесяці авечак здача воўны праводзіцца з пяці галоў;

пры наяўнасці ў гаспадарцы звыш дзесяці авечак па другой, трэцяй і чацвертай катэгорыях раёнаў згодна статута сельскагаспадарчай арцелі здача воўны праводзіцца за кожную авечку звыш дзесяці ў памеры адной трэці нормы.

4. Вызваліць калгасы і асобныя калгасныя двары ад пастаўкі воўны за чыстапародных бараноўвытворнікаў.

5. Паінструляваць вызваленне калгасных аўцагадоўчых таварных ферм ад паставак мяса дзяржаве ў частцы тонкарунных чыстапародных авечак.

6. Знізіць для калгасных аўцагадоўчых таварных ферм, метызуючых грубашэрсных авечак тонкарунными і цыгайскімі баранамі, норму здачы мяса з кожнай метызаванай маткі з 8 кгр. да 6 кгр.

7. Устанавіць, што за тонкую воўну, праданую калгасамі дзяржаве пасля выканання імі абавязковай пастаўкі воўны дзяржаве, калгасы атрымліваюць прэміі-надбаўкі, выходзячы з наступнага разліку:

а) ПА ТОНКАЙ ВОЎНЕ:

Пры продажу дзяржаве да 3-х кгр. тонкай воўны калгаснік атрымлівае прэмію-надбаўку за кожны кілограм праданай дзяржаве воўны ў памеры 15 проц. закупачнай цаны;

пры продажу дзяржаве тонкай воўны звыш 3-х кгр., але не больш 4½ кгр., калгаснік атрымлівае прэмію-надбаўку за кожны кілограм праданай дзяржаве воўны ў памеры 25 проц. закупачнай цаны;

пры продажу дзяржаве тонкай воўны звыш 4½ кгр., але не больш 6 кгр., калгаснік атрымлівае прэмію-надбаўку за кожны кілограм праданай дзяржаве воўны ў памеры 40 проц. закупачнай цаны;

пры продажу дзяржаве тонкай воўны звыш 6 кгр., але не больш 9 кгр., калгаснік атрымлівае прэмію-надбаўку за кожны кілограм праданай дзяржаве воўны ў памеры 60 проц. закупачнай цаны;

пры продажу дзяржаве тонкай воўны звыш 9 кгр., але не больш 12 кгр., калгаснік атрымлівае прэмію-надбаўку за кожны кілограм праданай дзяржаве воўны ў памеры 75 проц. закупачнай цаны;

пры продажу дзяржаве звыш 12 кгр. тонкай воўны калгаснік атрымлівае прэмію-надбаўку за кожны кілограм праданай дзяржаве воўны ў памеры 100 проц. закупачнай цаны.

б) ПА ПАЎГРУБАЙ ВОЎНЕ:

Пры продажу дзяржаве да 4½ кгр. паўгрубай воўны калгаснік атрымлівае прэмію-надбаўку за кожны кілограм праданай дзяржаве воўны ў памеры 15 проц. закупачнай цаны;

пры продажу дзяржаве паўгрубай воўны звыш 4½ кгр., але не больш 6 кгр., калгаснік атрымлівае прэмію-надбаўку за кожны кілограм праданай дзяржаве воўны ў памеры 25 проц. закупачнай цаны;

пры продажу дзяржаве паўгрубай воўны звыш 6 кгр., але не больш 9 кгр., калгаснік атрымлівае прэмію-надбаўку за кожны кілограм праданай дзяржаве воўны ў памеры 40 проц. закупачнай цаны;

пры продажу дзяржаве паўгрубай воўны звыш 9 кгр., але не больш 12 кгр., калгаснік атрымлівае прэмію-надбаўку за кожны кілограм праданай дзяржаве воўны ў памеры 60 проц. закупачнай цаны;

пры продажу дзяржаве паўгрубай воўны звыш 12 кгр., але не больш 18 кгр., калгаснік атрымлівае прэмію-надбаўку за кожны кілограм праданай дзяржаве воўны ў памеры 75 проц. закупачнай цаны;

пры продажу дзяржаве звыш 18 кгр. паўгрубай воўны калгаснік атрымлівае прэмію-надбаўку за кожны кілограм праданай дзяржаве воўны ў памеры 100 проц. закупачнай цаны.

V

У адпаведнасці з гэтай пастановай абавязаць Саўнаркомы рэспублік, абласныя (краявыя) выканкомы, абкомы, крайкомы і ЦК нацкампартый забяспечыць правядзенне наступных мерапрыемстваў. (У пастанове пералічваюцца 44 рэспублікі, краі і вобласці. Дзем лічбы, якія датычаць БССР).

ПА БЕЛАРУСІ

1. Метызаваць тонкарунными баранамі 325 тыс. авечак, для чаго прадаць калгасам 6.000 бараноў, у тым ліку заваэімых з соўгасаў Азова-Чорнаморскага края «прэкосаў» 1.000, а соўгасаў Крымскай АССР цыгайскіх 5.000.

2. Правесці штучнае абсямяненне 28 тыс. авечак, для чаго арганізаваць 10 новых пунктаў штучнага абсямянення і падрыхтаваць 15 работнікаў па штучнаму абсямяненню і 5 інструктароў.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ.

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)
І. СТАЛІН.

7 сакавіка 1936 г.

Да 75-годдзя са дня смерці украінскага паэта Тараса Шэўчэнка. На здымку: унукі паэта Харытон Пракоф'евіч Шэўчэнка і Пётр Іванавіч Шэўчэнка, калгаснікі сельгасарцелі «Чырвоны партызан» у сяле Шэўчэнка (УССР). Фота Сапожнікава (Саюзфота)

ПАСТАНОВА СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ САЮЗА ССР І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА ВКП(б)

А) Прызнаць, што загад наркамсоўгасаў тав. Калмановіча аб кастрацыі племянных бараноў і пісьмо Наркамзема СССР з алабарэннем гэтага загаду з'яўляюцца антыдзяржаўнымі дакументамі, якія маглі з'явіцца толькі ў рэзультаце бюракратычных адносін да дзяржаўных інтарэсаў.

Б) Скасаваць загад Наркамсоўгасаў і пісьмо Наркамзема СССР аб кастрацыі племянных бараноў, як парушаючыя інтарэсы дзяржавы.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ.

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)
І. СТАЛІН.

9 сакавіка 1936 г.

У СОЎНАРКОМЕ СССР І ЦК ВКП(б)

Аб гандлі бульбай

Пастановай Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) дазволена калгасам, калгаснікам і аднаасобнікам Паўночнага, Горкаўскага, Кіраўскага, Сталінградскага, Саратаўскага, Азова-Чорнаморскага, Паўночна-Каўказскага, Заходне-Сібірскага, Усходне-Сібірскага, Краснаярскага краёў, Калінінскай, Івана ўскай, Свердлоўскай, Омскай, Днепрапетроўскай, Одэскай, Данецкай абласцей, Карэльскай АССР, Башкірскай АССР, Кіргізскай АССР і МАССР рабіць беспераш кодны продаж сваёй бульбы дзяржаўным і кааператыўным арганізацыям, а таксама на гарадскіх і сельскіх рынках і станцыях чыгунак. (БЕЛТА).

Растлумачэнне Наркамзема СССР

Народны камісар земляробства Саюза ССР т. М. А. Чярноў выдаў пастанову аб парадку аплаты сенаўборачных работ, праводзімых МТС і машына-сенакоснымі станцыямі (МСС) у калгасах. На 1936 год размеры натураплаты сенам за сенакашэнне трактарнымі касілкамі МТС і МСС застаюцца такімі-ж, як у мінулым годзе, г. зн. не звыш 15 проц. ад валавога збору з фактычна скошанай плошчы.

Падкрэсліваецца, што работы па сенакашэнню, праведзеныя конной пягаю калгасаў, уборачным інвентаром МТС і МСС аплочваюцца калгасамі грашыма па ўзгодненню дырэктара МТС ці МСС з адпаведнымі калгасамі.

У Камісіі Совецкага Кантроля пры СНК СССР

Камісія Совецкага Кантроля заслухала даклады раду гаспадарчых органаў аб выкананні ў студзені і лютым плана першага квартала па вытворчасці **патэфонаў і пласцінак** і аб прымаемых мерах па выкананню задання 1936 года, павялічанага ў параўнанні з 1935 годам у некалькі раз.

Камісія Совецкага Кантроля прызнала мерапрыемствы, прадаўзімыя Грампласттрастам па забеспячанню выканання праграмы 1936 года па выпуску патэфонаў і пласцінак **зусім нездавальняючымі.**

Дырэктару ногінскага завода грамафонных пласцінак тав. Байкову зроблена папярэджанне, што ў выпадку невыканання праграмы і выпуску пласцінак нізкай якасці ў далейшым, будзе пастаўлена пытанне аб зняцці яго з работы з паніжэннем па пасадзе.

Начальніку Галоўметыза тав. Залатарову ўказана на непрыняцце мер к выкананню праграмы ленінградскім заводам «Красный гвоздильщик» па вытворчасці патэфонных пружын і прапанавана наладжыць спагнанні на віноўных у сістэматычным зрыве вытворчасці і адгрузкі патэфонных пружын нізкай якасці.

Старшыні Усекапромметалсаюза тав. Трэскунову прапанавана перагледзець узор і забяспечыць вытворчасць патэфонаў больш дасканалага тыпу і высокай якасці.

**

Далей было разгледжана пытанне аб выкананні НКЛегпромам пастановы Совета працы і абароны ад 28 ліпеня 1935 г. аб развіцці вытворчасці **замяніцеляў скуры.** У прынятым па гэтаму пытанню рашэнні адзначаецца, што не глядзячы на выкананне НКЛегпромам пастановы Совета працы і абароны ў частцы расшырэння вытворчасці і выпуску новых відаў замяніцеляў скуры, а таксама ў частцы падрыхтоўкі да новага будаўніцтва і рэканструкцыі існуючых прадпрыемстваў, — асноўныя рашэнні ўрада аб паляпшэнні якасці і асартыменту скурзамяніцеляў **не выкананы.**

Начальніку Галоўнага кіраўніцтва скураной прамысловасці тав. Маргулісу і кіраўніку трэста «Кожсуррогат» тав. Тагенбауму ўказана на невыкананне рашэнняў урада аб павышэнні якасці замяніцеляў і паляпшэнні тэхнікі арганізацыі вытворчасці на фабрыках. Нам. Наркамлегпрома тав. Мышкову прапанавана неадкладна правесці аператыўныя мерапрыемствы, якія-б забяспечвалі выкананне рашэння Совета працы і абароны аб паляпшэнні якасці і асартыменту скурзамяніцеляў.

**

Апрача таго, было разгледжана пытанне аб **злоўжываннях у смаленскай канторы рамонтна-мацыннага трэста НКЦяжпрома.** У сувязі з паступіўшай у Камісію Совецкага Кантроля заявай аб злоўжываннях у смаленскай канторы, бюро скаргаў КСК было даручана кіраўніцтву трэста неадкладна праверыць гэту заяву. Праверыўшы гэту заяву, кіраўнік Раммэштрэста тав. Шмаеў паведаміў, што яна не пацвердзілася і што ў смаленскай канторы ўсё добра.

Тым часам па паўторнай заяве, перададай ужо ў следчыя органы, устаноўлена, што работнікі смаленскай канторы на чале з галоўным бухгалтарам Аркадзевым займаліся арганізаваным раскраданнем дзяржаўных сродкаў, раскраўшы з 1932 года звыш 125 тысяч руб. Гатыя злачынствы не былі своечасова ўскрыты трастам, не гледзячы на сістэматычныя абследванні канторы ў 1934-35 гг.

За безадказныя, бюракратычныя адносіны да сігналаў аб злоўжываннях у смаленскай канторы кіраўніку Раммаштрэста тав. Шмаеву і яго намесніку тав. Тівіну абвешчана вымова.

Пракурору РСФСР тав. Антонаву-Оўсеенка прапанавана прыцягнуць да крымінальнай адказнасці за злачынна-фармальныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў работнікаў Раммаштрэста Лук'янчука, Каралёва і Валадарскага, якія былі пасланы для праверкі работы канторы, фактычна ніякай праверкі не правялі і паведамілі, што ў смаленскай канторы ўсё ў парадку.

Становішча працоўных жанчын у Заходняй Беларусі

Цяжкая і бязрадасная доля працоўнай жанчыны Заходняй Беларусі. Працуючы народ з мужчынай, жанчына-работніца атрымлівае толькі палову ці ⅓ мізэрнай зарплаты. Дзенны заработак работніцы на гумовай фабрыцы «Ардаль» у Лідзе складае 30 грошаў (30 кап.) Беластоцкая кваліфікаваная тэкстыльшчыца, віленская пальчатачніца зарабляе ў сярэднім па 20—25 злотых за тыдзень. Нярмальны рабочы дзень 12—16 гадзін, а часам нават 18—20 гадзін.

На кожным кроку работніца падвяргаецца здзекаванням, зняважэнню і нават збіванням з боку майстра, фабрыканта. На беластоцкай тэкстыльнай фабрыцы была звычайкі збіта работніца Душко толькі за тое, што яна адважылася папрасіць у майстра масла для чысткі машын. На фабрыцы «Ардаль» інакш як «хамка», «ідыётка» да работніцы не зварачаюцца. За малейшае непадпарадкаванне майстру, невыкананне яго капрызу жанчыну выкідваюць з прадпрыемства. Умовы працы на фабрыках жудасныя.

Нават такая чорнасоценная газета, як «Варшавскі дзённік народовы», прымушана была пісаць аб тым, што «на тэкстыльных фабрыках адсутнічае ўсякае прымітыўнае папераджальнае абсталяванне, як пыласосы і вентыляцыя. Абураючыя гігіенічныя ўмовы спрыяюць прафесійным захворванням і ў першую чаргу туберкулёзу лёгкіх».

«Мы працуем у пекле, — пішуць рабочыя цагельнага завода ў Казлоўшчыне. — У сухое надвор'е працуем з 6 гадзін раніцы да 7 вечара; за цэлы дзень работы атрымліваем 70 кап. Жывем мы пры заводзе, але калі-б вы паглядзелі гэтыя дыры—сабакі ў горадзе напэўна жывуць у лепшых норах».

Пасля цяжкага рабочага дня на фабрыцы работніца пачынае не менш цяжкі дзень дома. Трэба накарміць, адзець і абуць дзяцей, якія цэлы дзень валяліся на вуліцы, трэба пасціраць і прыбрэць. Пра яслі, пра дзетсады, пра грамадскае харчаванне, на якое наш совецкі ўрад выдаткоўвае мільярды, работніца Заходняй Беларусі нават марыць не можа ва ўмовах фашысцкага ладу.

Мацярынства — велізарнейшая радасць жанчыны Совецкага Саюза — становіцца няшчасцем для працоўнай жанчыны Заходняй Беларусі. Новае дзіцё — гэта новы рот, які трэба карміць, з карміць няма чым. Ніякай аховай мацярынства цяжарная работніца не карыстаецца. Яна імкнецца ўтаіць сваю цяжарнасць, каб яе з-за гэтага не выкінуў прадпрыемца. Працуючы да апошняй мінуты ля варштата, яна адразу пасля родаў зварачаецца да сваёй работы. Ванючая прыбіральня, дзе яна корміць дзіцё, замяняе ёй яслі. Распе колькасць тайных абортаў, бо ў фашысцкай Польшчы аборты забаронены.

Яшчэ больш бязрадаснае становішча працоўнай жанчыны на вёсцы.

Вёска Заходняй Беларусі задыхаецца ад зямельнага голаду. Каланіяльная палітыка польскага фашызма, падаткі, камасацыя канчаткова зруйнавалі беларускую вёску. Працоўныя сяляне паміраюць з голаду. Гэтага нават не можа ўтаіць буржуазны друк. Вось што піша «Ілюстраваны курэр подзённы» пра жыццё нарачанскіх сялян:

«Хлеб ядуць толькі да калад, а потым толькі бульбу. Калі не хопіць бульбы — галадаюць, просяць у другіх. Заналак не купляюць. З адной хаты ў другую носяць гаршок з агнём, атрымным з крамня. Газу могуць купляць толькі самыя багатыя ў вёсцы».

На фоне гэтай галечы і голаду можна сабе ясна ўявіць становішча працоўнай сялянкі. Цяжка працуючы ад ранку да ранку, працоўная сялянка Заходняй Беларусі не можа нават прахарчаваць сваіх дзяцей. Вясковыя дзяўчыны не могуць выйсці замуж, бо трэба мець у прыданае зямлю, а зямля знаходзіцца ў руках памешчыкаў.

У «дасягненні» фашысцкай цывілізацыі можна запісаць такія факты, калі сялянкі Віленшчыны ў асобных выпадках, даведзеныя галечай і голадам да адчаю, прадавалі за некалькі пудоў бульбы сваіх дзяцей. Распе бязграматнасць на вёсцы і асабліва сярод жанчын. Газета, кніга з'яўляецца рэдкім госцем, цэлай падзеяй у вёсцы.

З'яўляючыся фармальна роўнапраўнай, працоўная жанчына фактычна бяспраўная. Ні ў адным з органаў самакіравання, ні на адной з выбраных дзяржаўных пасад вы не знойдзеце жанчыны. Наадварот — урад звальняе замужніх жанчын, працуючых у дзяржаўных установах. Даволі часта жанчына тоіць тое, што яна знаходзіцца ў браку, каб застацца на рабоце і мець магчымасць пракарміць сям'ю.

Польскі фашызм, як і нямецкі фашызм, лічыць, што жанчына прызначана ў асноўным для кухні, касцёла і нараджэння дзяцей. Гэта, аднак, не перашкаджае польскаму фашызму рабіць усё для таго, каб завабіць працоўную жанчыну на свой бок — не для таго, каб яе разняволіць, а для таго, каб выкарыстаць яе ў барацьбе супроць рэвалюцыйнага руху, для таго, каб трымаць яе ў пакоры, пад уплывам клера, для таго, каб забяспечыць сабе тыл у вайне, якая рыхтуецца.

Польскі фашызм узмоцнена мілітарызуе працоўную жанчыну. Створаны мілітарызаваныя лагеры працы ў Лодзі, выдан закон аб абавязковым вайсковым абучэнні ўсіх фабрычных работніц. На лета былі адкрыты спецыяльныя ваенныя лагеры.

Адзінай партыяй, якая змагаецца за канчаткове вызваленне, за поўнае разняволенне працоўнай жанчыны, з'яўляецца комуністычная партыя Заходняй Беларусі. Распе і мацнее пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі народны антыфашысцкі фронт барацьбы ў Польшчы і Зах. Беларусі. Распе і мацнее ўдзел працоўнай жанчыны ў гэтым народным фронце. У адказ на спробы польскага ўрада фашызаваць класавы профрух, беластоцкія тэкстыльшчыкі адказалі масавым уступленнем у класавы профсаюз. Ужо другі месяц цягнецца гераічная забастовачная барацьба на гумовай фабрыцы «Ардаль», дзе большасцю рабочых з'яўляюцца жанчыны. Пяць тыдняў баставалі рабочыя і работніцы табачнай і гарэлачнай манаполіі. Працоўныя сялянкі прымаюць актыўны ўдзел у справе збору дапамогі для бастуючых лесарубаў Белавежы. Разам са сваімі мужамі яны аказваюць адпор экзекутарам і кзрным экспедыцыям.

Працоўныя жанчыны Заходняй Беларусі, ламаючы перашкоды фашысцкага тэрору, ламаючы перашкоды абыватальшчыны, домастроеўскіх поглядаў і звычаяў, разам з усім рабочым класам, а усімі працоўнымі Польшчы пад кіраўніцтвам гераічнай компартыі ўступаюць на шлях барацьбы за дыктатуру пролетарыята.

Л. МАЙСКАЯ.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА ПЕРАДАВІКОЎ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

Прамова т. М. В. РАЕЎСКАГА

АТАРШЫНЯ КАЛГАСА «ГОМЕЛЬСКІ ПРОЛЕТАРЫЙ», ЛОЕЎСКАГА РАЁНА, УЗНАГАРОДЖАНЫ ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

Таварышы, дазвольце ад імя калгаснікаў і калгасніц Лоеўскага раёна перадаць пчырае прывітанне правадыру народаў таварышу **Сталіну (апладысменты)**, кіраўнікам партыі і ўрада БССР, ордэнаносцам тт. **Гікало і Галадзеду, тав. Чарвякову. (Апладысменты).**

Наш калгас дабіўся вялікага поспеху. Я і аўчар **Барушкоў** атрымалі ордэны Працоўнага Чырвонага сцяга за выдатную работу ў галіне жывёлагадоўлі.

Наш калгас арганізаваўся ў 1929 годзе. У мясцовасці існавалі бандыты. Некалькі разоў падпальвалі наш калгас і знішчалі ўсё пагалоўе жывёлы. У 1929 годзе мы мелі ў калгасе ўсяго толькі 24 кароні, 21 карову. У даны момант у калгасе маем 364 галавы рагатай жывёлы, 214 коней, 196 свіней і 416 авечак.

Мы ўзнагароджаны ордэнамі за развіццё аўцагадоўлі. Вы ўсе добра ведаеце, што аўцаводства раней было на апошнім плане. Некаторыя «вучоныя» нават гаварылі аб тым, што ў Беларусі няма ўмоў для развіцця аўцагадоўлі. Практыка нашай работы разбіла ўсе гэтыя «тэорыі». Аўцагадоўля можа ў нас добра развівацца. Гэта паказвае вопыт нашага калгаса. Так, напрыклад, у 1935 годзе ад 100 простых аўцаматак мы атрымалі 162 ягняці **(апладысменты)**, атрымалі настрыгу шэрсці па тры кілограмы ад кожнай.

Для таго, каб узняць аўцагадоўлю яшчэ на вышэйшую ступень, мы пачалі праводзіць штучнае абсемяненне. Мы дасталі аднаго барана-мярынос цыгайскай пароды, і праз штучнае абсемяненне ад яго абсемянілі 500 аўцаматак калгаса і калгаснікаў. У гэтым годзе мы мяняем цыгайскую пароду на прэкос.

Што дае нам штучнае абсемяненне? Штучнае абсемяненне дае нам 98 проц. акоту, ад простых авечак атрымліваюцца ягняты цыгайскай пароды. Шэрсць таксама лепшай якасці, і дзяржава плоціць за яе ў тры разы даражэй. Шэрсць палепшанай пароды з'яўляецца лепшай і ў прамысловасці. У нашым калгасе працуюць тры гурткі, адзін з іх па вывучэнню агразоотэхнімінімуму. 68-гадовы стары, ордэнаносец Барушкоў, акуратна наведвае гурток і сароміць тую моладзь, якая пасіўна адносіцца да вучобы і не працуе так, як ён.

Наша задача заключаецца ў тым, каб вучыцца і ўдумацца жывёлагадоўлю. Трэба ведаць, як даглядаць авечак. Авечкі трэба пасвіць на халмістых мясцовасцях у дажджлівую пагоду нельга выпускаць іх на пасбішча, і іх трэба абавязкова падкармляць. Ад дажджлівай пагоды авечкі вельмі прападаюць. Як павысіць прыплоду? Мы а тав. Баршуковым далі абяцанне таварышу Сталіну ў тым, што мы ў 1936 годзе дабемся 180 ягнят ад 100 простых аўцаматак і настрыжом па 3,7 кілограма шэрсці з кожнай авечкі. Мы далі абяцанне даць шэрсць лепшай якасці, бо ў мінулыя гады давалі дрэнную шэрсць, што вельмі перашкаджала рабоце нашай прамысловасці.

Пасля таго як авечкі акацяліся, ягнят дапускаем да аўцаматак. Калі ягняты пачнуць есці сена, іх трэба аддзяліць ад аўцаматак і пачаць узмоцнена карміць іх і авечак. Такім чынам, мы можам дабіцца больш двух акотаў за год. Мы думаем у 1936 годзе мець не менш 100 авечак, якія дадуць па тры ягняці ў год, а ўсе астатнія — па два.

Хачу запэўніць усіх удзельнікаў, асабіста таварыша Гікало і наш урад у асобе тт. Чарвякова і Галадзеда, што наш калгас і надалей будзе дастойным калгасам у Беларусі і што мы абавязваемся ў 1936 годзе выйсці ў перадавыя рады не толькі нашага раёна, але і Беларусі як па развіццю жывёлагадоўлі, так і па узняццю ўраджайнасці. Гэтага мы даб'ёмся.

Мы абавязваемся ў 1936 годзе падрыхтаваць для нашай Чырвонай арміі не менш 40 кавалерыйскіх добрых коней і 80 чалавек добрых кавалерыстаў. У выпадку нападу на нас імперыялістаў мы дамо жорсткі адпор. **(Апладысменты).**

Няхай жыве вялікі правадыр і настаўнік народаў усяго свету таварыш **Сталін! (Апладысменты).**

Няхай жыве комуністычная партыя большэвікоў Беларусі на чале з т. **Гікало! (Апладысменты).**

Прамова т. Т. А. РУСАКОВІЧА

ЗООТЭХНІК СОЎГАСА «НАЧА-ШПАКОЎШЧЫНА», ВЕТРЫНСКАГА РАЁНА

Таварышы! Рабочы калектыў нашага соўгаса даручыў мне перадаць палкае прывітанне нашаму любімаму роднаму таварышу Сталіну **(апладысменты)**, нашым слаўным ордэнаносцам тт. Гікало і Галадзеду. **(Апладысменты).**

Даазвольце падзяліцца некаторым вопытам сваёй работы. Працую я зоотэхнікам з 1934 года. Перада мной, як перад комсамольцам, была пастаўлена задача —апрацаваць званне спецыяліста. Калі я прыехаў у соўгас, у нас было гаспадарчае становішча са здачай прадукцыі дзяржаве. План мясаздачы быў выкананы на 95 проц. і сярэдняя вага з даваемай прадукцыі была 75 кілаграмаў. Першай задачай, якую я паставіў перад сабой, — гэта выканаць дзяржаўны план выключна жывёлай кандыцыйнай упітанасці. У 1935 годзе мы здалі дзяржаве 220 галоў сярэдняй вагой у 148 кілаграмаў. Такім чынам, план мясаздачы быў выкананы на 102 проц.

Я арганізаваў зоотэхнічны гурток, які наведвалі рабочыя. Тэарэтычныя веды мы ўкаранілі ў сваёй практычнай рабоце. У нашым соўгасе ёсць рэкорды па прыплоду — на кожную свінаматку па 50 пудоў. Мы дабіліся ад некаторых свінаматак па 25 дзелавых парасят.

Мы маем некаторыя дасягненні і па буйнай рагатай жывёле. У 1935 годзе мы павінны былі атрымаць ў кожнай каровы па 1550 літраў, а надаілі па 1.990 літраў. План малакоздачы выканалі на 112 проц.

Некалькі слоў пра кадры. Пад кіраўніцтвам палітаддзела вырашчаны і выхаваны добрыя кадры ў нашым соўгасе. Да іх адносяцца ў першую чаргу ордэнаносец Грэчушнік Лена, Грэчушнік Ольга і Карандзей, якія сістэматычна перавыконваюць свае планы.

На гэтай нарадзе нямала прысутнічае зоотэхнікаў, якія маюць сярэднюю і вышэйшую асвету. Трэба прама сказаць, што мы яшчэ працуем недастаткова.

Мы, спецыялісты, у 1936 стахановскім годзе павінны пераключыцца на тое, каб наша ордэнаносная Беларуская сацыялістычная рэспубліка вышла ў перадавыя рады па жывёлагадоўлі. Бару на сябе абавязак дабіцца ў 1936 г. на кожную свінаматку 20 дзелавых парасят і 75 пудоў мяса, атрымаць на кожную фуражную карову па 3.000 літраў замест 2.000. Я на гэтым не абмяжуюся. Невялікі вопыт сваёй работы абавязуюся перанесці ў бліжэйшыя калгасы, каб і яны атрымалі высокую прадукцыю ад сваёй жывёлы і агульнымі сіламі выведаем наш Ветрынскі раён у перадавыя раёны нашай рэспублікі.

Тыя задачы, якія пастаўлены перад намі партыяй і нашым любімым правадыром таварышам Сталіным, мы з гонарам выканаем.

Няхай жыве наш любімы родны таварыш **Сталін! (Апладысменты).**

Прамова тав. І. Н. ЧЫСЛОВА

ПЧАЛЯР КАЛГАСА ІМЯ ЯКАЎЛЕВА, БАРЫСАЎСКАГА РАЁНА

Таварышы, дазвольце мне перадаць прывітанне нашаму роднаму таварышу Сталіну ад імя нашых калгаснікаў Бабруйшчыны **(бурныя апладысменты).**

Таварышы, дазвольце мне перадаць прывітанне нашым беларускім кіраўнікам — ордэнаносцам тт. Гікало, Галадзеду, а таксама тав. Чарвякову.

У 1932 годзе наш калгас ледзь не разваліўся. Але калі выйшлі з калгаса кулакоў і падкулачнікаў, то многа новых людзей уступіла ў калгас. Прайшло месяцаў тры, і вось уноў уступіўшыя ў калгас упалі ў паніку, што 6.000 рублёў мае калгас запазычанасці. Я тады на сходзе выступаю і гавару, што за два гады сваімі пчолкамі выплачу, толькі дайце мне дапамогу, купіце мне насенне шведскай канюшыны, гарчыцы — падсеўныя мёданосы, бо ў нас іх не хапае.

Купілі і пасеялі крыху—усяго 0,3 гектара. У 1931 годзе я пасеў дадаць не толькі два з паловай пуды з вулля, як я гаварыў, але яшчэ на поўпуда больш. Узрадаваліся калгаснікі, прадалі мёд, выручылі 2.500 рублёў, астатні разменкавалі сярод калгаснікаў.

Мяне за гэта прэміравалі. Атрымаў я два пуды пшанічнай мукі і кажух. Паехаў на рабінную выстаўку, там атрымаў прэмію 50 рублёў. **(Апладысменты).**

У 1933 годзе ў мяне для пчол меліся штодзенныя мёданосы. У гэтым годзе асабліва выдзеліліся два раі пчол, з якіх адзін даў 96 кілограм мёду, а другі—105 **(Апладысменты).** Астатнія сем'і далі па 48 кілограмаў **(Апладысменты).** Прадалі мы мёд і выручылі 7.500 рублёў **(апладысменты)**, астатні раздалі калгаснікам.

Зноў мяне прэміравалі — далі аўчыны на шубу. Вось я пяпер у ёй хаджу. **(Апладысменты).** На рабіннай выстаўцы мяне зноў прэміравалі.

У 1934 годзе выбралі мы новага старшыню, прысланага з горада. Старшыня пасяліўся са мною ў адной кватэры. Спачатку чалавек быў вясёлы, а пасля апусціў галаву. Я гавару: «Тав. Яўно, што ты так упаў духам». — «А што рабіць, — гаворыць старшыня,— 200 рублёў аддаў на куплю гародніна насення і яшчэ мала, калёсы ўсе разбітыя і няма грошай, няма за што купіць». Я гавару: «Расходваў 200 рублёў, расходуй 2.000 мала 2.000, расходуй 3.000, вядзі справу і будзь упэўнен, што я ад пчол менш не дам табе ў гэтым годзе, як 7.000, а то і больш.

І вось мой Яўно супакоіўся і павёў справу. Пачаў я катаць свой мёд. Атрымалася па 40 кілограм ад кожнага рою. Частку прадалі і выручылі 8.500 руб. **(апладысменты)**, астатні раздалі калгаснікам.

На сённяшні дзень у мяне ёсць 65 рояў. **(Апладысменты).** За лета 1936 года думаю давесці пасеку да 107 рояў.

Дазвольце мне перадаць прывітанне нашаму таварышу **Сталіну (апладысменты)**, тав. **Будзённаму**, тт. **Гікало, Галадзеду і Чарвякову. (Апладысменты).**

Прамова тав. Ф. С. ЗАЙЦАВА

ОРДЭНАНОСЕЦ, ЗАГАДЧЫК ФЕРМАЙ КАЛГАСА ІМЯ ЧАРВЯКОВА, РЭЧЫЦКАГА РАЁНА

Таварышы, дазвольце перадаць гарачае прывітанне вялікаму правадыру таварышу Сталіну **(апладысменты)**, тт. Гікало, Галадзеду і Чарвякову ад калгаснікаў Рэчыцкага раёна! **(Апладысменты).**

Таварышы, я ўзнагароджан найвялікшай узнагародай — ордэнам Леніна. Узнагарода ордэнамі перадавых людзей паказвае, як наша партыя, урад і таварыш **Сталін** клапоцяцца аб нас, ацэньваюць нашу работу.

Я ў 1930 годзе ўступіў у калгас. Да калгаса я быў пастухом сяла. У 1931 годзе пасаіў калгасных кароў, у 1932 годзе працаваў у палявой брыгадзе і ў 1933 годзе — пачаў працаваць на свінарніку.

Было тады ў калгасе 4 свінаматкі, а ў 1935 годзе было 8 свінаматак. Ад кожнай свінаматкі я выгадаваў па 25 парасят.

Тут могуць сказаць, што гэта немагчыма. Я раскажу, як я гадаваў гэтых парасят.

Амаль усе свінаматкі апарасіліся і далі па 12—13 парасят, а адна прывяла 17 парасят. Гэта свінаматка не магла адразу карміць іх усіх, паколькі ў яе было 14 саскоў. Што я зрабіў? Кожныя 10 мінут я адлучаў ад грудзей па 3 парасят. Гэта ў першыя 7 дзён. На другім тыдні трое парасят зусім адлучыў ад грудзей, карміў малаком. У рэзультаце — усе 17 парасят выгадаваў. У гэтай справе патрэбна толькі жаданне. Ніякага цуду няма ў тым, каб выгадаваць 25 парасят ад свінаматкі.

Калі свінаматка павінна парасіцца — траба ўважліва сачыць за ёй. Калі своечасова не даглядзець, могуць быць страты.

Некаторыя парасяты нараджаюцца з іглами, і калі пачынаюць смактаць, яны кусаюць матку. На гэта таксама трэба звярнуць увагу, іглы трэба зрэзаць.

Я за сваімі парасятамі сачыў і ноччу і днём.

Як я кармію парасят? Адлучаў ад грудзей, калі парасятам было па тры тыдні. Першыя чатыры дні даваў малако, потым даваў бульбу, муку змешаную з малаком і кармію так месяц. Потым дабаўляў больш грубыя кармы.

У 1935 годзе план камплектавання фермы выканалі, выручылі 8.800 рублёў ад праданых свіней суседняму калгасу, калгаснікам сваім далі па 2, а некаторым па 3 парасят.

Мяне выклікалі ў Маскву і ўзнагародзілі за добрую работу ордэнам Леніна.

Я даю абяцанне партыі і ўраду, што ў 1936 годзе здам не менш 26 парасят ад кожнай свінаматкі, здам ад кожнай каровы 4.000 літраў малака, ад кожнай цельнай каровы выгадую цялё.

Я абяцаю ўсім удзельнікам нарады, што буду дапамагаць людзям нашага раёна працаваць так, як і я.

Даю абяцанне тав. Будзённаму выгадаваць добрага каня ў 1936 годзе для Чырвонай арміі.

Няхай жыве комуністычная партыя ва ўсім свеце!

Няхай жыве наш дарагі правадыр, вялікі правадыр усяго свету таварыш **Сталін! (Апладысменты).**

75-ГОДДЗЕ СА ДНЯ СМЕРЦІ УКРАІНСКАГА ПАЭТА ТАРАСА ШЭЎЧЭНКА

Тарас ШЭЎЧЭНКА.

ДУМКА

Цяжка-цяжка жыць на свеце
Сіраце без роду:
Няма куды прыхіліцца,—
Хоць з гары ды ў воду!
Утапіўся-б маладзенькі
З нудой ў быстрай рэчцы;
Утапіўся-б — цяжка жыці,
І няма дзе дзецца.
Ў каго доля ходзіць полем,
Каласкі збірае,
А мая дзесь, нягодніца,
За морам блукае.
Добра таму багатаму:
Яго людзі знаюць:
А са мною сустрэнуцца —
Бокам абмінаюць.
Багатага губатага
Дзяўчына шануе;
З мяне, сіраты гаротнай,
Смяецца, жартуе.
«Ці я-ж табе не прыгожы,
Ці не ў цябе ўдаўся,
Ці не люблю цябе шчыра,
Ці з цябе смяяўся?
Любі-ж сабе, маё сэрца,
Любі, каго знаеш,
Але з мяне ты не смейся,
Калі ўспамінаеш.
А я пайду на край свету...
На чужой старонцы
Знайду лепшую, ці згіну,
Як той ліст на сонцы».
Пашоў казак сумуючы,
Нікога не кінуў;
Шукаў долі ў чужым полі,
Ды там і загінуў.
Уміраючы, ўглядаўся,
Дзе сонейка взяе...
Цяжка-цяжка памірацi,
Цяжка ў чужым краі!

(1840)

З украінскай мовы пераклаў **ЯНКА КУПАЛА.**

Тарас ШЭЎЧЭНКА

Семдзесят пяць год назад (24 лютага (ст. ст.) 1861 г.) замучаны царскай турмой і ссылкай, 47 год ад роду, памёр вялікі украінскі паэт-мысліцель, рэвалюцыянер - дэмакрат **Т. Г. Шэўчэнка.**

Імя Шэўчэнка, як паэта-рэвалюцыянера і вялікага мысліцеля сваёй эпохі, стаіць побач з такімі імёнамі, як Чарнышэўскі, Дабралюбаў, Некрасаў. Яго імя і творчасць шырока вядомы не толькі працоўным масам Украіны, Совецкаму Саюзу, але і ўсяму свету.

Шэўчэнка нарадзіўся 25 лютага (ст. ст.) 1814 г. у сяле Марынцах, Звенігарадскага павета 6, Кіеўскай губерні. Бацька Шэўчэнка — прыгонны селянін, які памёр ад непасільнай працы на паншчыне.

Пасля смерці бацькі Шэўчэнка з самага дзяцінства перажывае няжар і жудасць наёмнай працы: ён у заможных аднасяльчан носіць ваду, пасе авечкі, затым працуе батраком у папа, а праз некаторы час застаецца ў памешчыка Энгельгарта ў якасці служкі. У 1831 г. Шэўчэнка, як служка памешчыка Энгельгарта, пападае з апошнім у Пецербург, дзе знаёміцца з мастаком Брулавым і паэтам Жукоўскім.

Пры садзейнасці Брулава і Жукоўскага, Шэўчэнку за 2.500 руб. выкупляюць з прыгоннічай няволі.

У Пецербурзе Шэўчэнка вучыцца ў Акадэміі мастацтваў, зблізжаецца з падпольным гуртком польскіх рэвалюцыянераў, зачытваецца рэвалюцыйнай літаратурай і вывучае замежныя мовы.

У 1840 г. Шэўчэнка выдае свой першы паэтычны зборнік «Кабзар». Следам за «Кабзаром» да 1847 г. ён выдае «Гайдамакі», «Капярына», «Наймічка» і рад іншых твораў.

Сваёю творчасцю Шэўчэнка прынёс у украінскую літаратуру магутнае абурэнне і нянавісць працоўных мас сялянства супроць парска-памешчыцкага прыгоннічага ладу. Ён безлітасна бічаваў і цара, і памешчыка, і папа — усіх тых, хто сядзеў на карку працоўнага селяніна і жыўіўся яго потам і крывёй.

За смелыя і вострыя свае вершы, накіраваныя супроць цара, памешчыка, чыноўнікаў і папоў, за сувязь з рэвалюцыйнымі гуркамі Шэўчэнку не адзін раз парскі ўрад замыкаў у турмы і ссылаў у далёкую высылку. Дзесяцігадовая (1847—1857) высылка ў Заказпійскую крэпасць — катаргу нікалаеўскай салдатчыны —смяротэльна падасіла яшчэ маладыя сілы Тараса Грыгор'евіча. Адпраўляючы ў высылку, царскі ўрад даў загад не толькі трымаць Шэўчэнка пад суровым наглядам, але нават забараніў паэту далей займацца паэтычнай дзейнасцю. Не гледзячы на гэты дзікі рэжым, Шэўчэнка, хаваючыся ад нагляду, укладаў свае пачуцці нянавісці да цара і эксплаататараў у новыя пазмы і вершы. У гэты перыяд ім напісаны цэлы рад выдатных па сваёй мастацкай сіле і рэвалюцыйнаму размаху твораў («Княжна», «Іржавець», «Титарівна», «Між скаламі неначе злодэй» і інш.).

Пасля смерці Тараса Грыгор'евіча царскі ўрад самым жорсткім чынам забараняў ушаноўваць яго памяць, забараняў яго творчасць. З повазу гэтага **В. І. Ленін** пісаў: **«Забарона ўшанавання Шэўчэнка была такой прыгожай, цудоўнай, на рэдкасць шчаслівай і ўдалай мерай з пункту гледжання агітацыі супроць урада, што лепшай агітацыі і ўявіць сабе нельга... Пасля гэтай меры мільёны і мільёны «абываталяў» пачалі ператварацца ў свядомых грамадзян і пераконвацца ў правільнасці таго сцвярджэння, што Расія ёсць «турма народаў».**

Але было-б не верна сказаць, што Шэўчэнка быў ад пачатку да канца паслядоўным рэвалюцыянерам. Ён у сваёй літаратурна-грамадскай дзейнасці ярка адлюстроўваў супярэчнасці таго класа, з якога выйшаў і выказнікам якога быў. Ён паказаў сілу і слабыя бакі сялянскага рэвалюцыйнага руху да выхаду рабочага класа на гістарычную арэну. У яго, асабліва ранняй, творчасці мела месца нацыяналістычная абмежаванасць, якая шкодзіла паэту яшчэ глыбей і ўстрэй паказаць твар прыгонніцкай Расіі — «турмы народаў».

«Шукаючы выхаду з навакольнай прыгнятаючай рабскай рэчаіснасці, Шэўчэнка, асабліва ў сваіх ранніх рамантычных творах, звяртаецца раз па разу да украінскай мінуўшчыны, пераважна да сялянскіх рухаў мінулых стагоддзяў і, будучы ў той час пад значным уплывам памяшчыцкай літаратуры, часамі па-нацыяналістычнаму асаятляў гэта мінулае, ідэалізуючы казацка-старшынскі лад, славаславячы ў некаторых творах нават гетманаў» *).

Буржуазныя контррэвалюцыйныя украінскія нацыянал-дэмакраты (а ў дапамогу ім і беларускія), чапляючыся за нацыяналістычным моманты творчасці Шэўчэнка, і ў дадатак да гэтага —фальсіфікуючы яго творы, імкнуліся зрабіць Шэўчэнка буржуазна-кулацкім нацыяналістам. Яны рэвалюцыйна-дэмакратычны змест творчасці Шэўчэнка выхалашчвалі, талкавалі па-свойму, робячы гэтым зладзейскую, контррэвалюцыйную справу вакол паэта-рэвалюцыянера.

Але як контррэвалюцыйныя нацдэмы ні імкнуліся рэвалюцыйна-дэмакратычны змест творчасці Шэўчэнка выкарчаваць з свядомасці мільённых працоўных мас, —ім гэта зрабіць не ўдалося.

Працоўныя масы Украіны, пад кіраўніцтвам партыі, выкарчавалі (і выкарчоўваюць) з усіх куткоў і куточкаў контррэвалюцыйных нацдэмаў, выкарчоўваюць усіх ворагаў рабочага класа і іх ідэі, і, крытыкуючы па-большэвіцку нацыяналістычныя моманты ў творчасці Шэўчэнка, паказалі, што Шэўчэнка быў і застаецца яркім барацьбітом за рэвалюцыйна-дэмакратычныя ідэі свайго часу, барацьбітом супроць тых, хто сотні год трымаў працоўныя сялянскія масы ў няволі, пакутах і галечы.

Шэўчэнка і яго творчасць высока, па-сапраўднаму ацанілі і будуць цаніць працоўныя масы ўсяго Совецкага Саюза. Тыя помнікі, якія працоўныя масы, пралетарыят Украіны будуюць на плошчах сацыялістычных гарадоў, з'яўляецца адным з яркіх доказаў высокай ацэнкі вялікага паэта-мысліцеля, рэвалюцыйнага дэмакрата Тараса Грыгор'евіча Шэўчэнка.

*) Тэзісы аддзела культуры і прапаганды ленінізма ЦК КП(б)У да 120-годдзя з дня нараджэння Т. Г. Шэўчэнка.

С. КУНІЦКІ.

ПЕРАД УСЕСАЮЗНАЙ СТАХАНАЎСКАЙ ДЭКАДАЙ НА ТРАНСПАРЦЕ

Работнікі Забайкальскай чыгункі звярнуліся да чыгуначнікаў Совецкага Саюза з прапановай правесці ў сакавіку стаханаўскую дэкаду на чыгунцы. Прапанову забайкальцаў адразу-ж падхапілі чыгуначнікі раду дарог. Тав. **КАГАНОВІЧ,** ухваліўшы гэту ініцыятыву, устанавіў тэрмін правядзення стаханаўскай дэкады з 15 па 25 сакавіка.

Як рыхтуюцца да стаханаўскай дэкады на чыгуначных вузлах БССР?

Начальнік палітаддзела гомельскага аддзялення службы эксплаатацыі тав. **Асіповіч** у гутарцы з рэботнікам «Звязды» паведаміў па гэтаму повазу наступнае:

На скліканай пры палітаддзеле нарадзе трыкутнікаў служб аддзялення выяснілася, што падрыхтоўка да стаханаўскай дэкады ідзе слаба. Не выконваецца рад асноўных паказальнікаў. Станцыі Васілевічы, Рэчыца, Касцюкоўка і інш. дрэнна падрыхтоўваюцца да прыёму паяздоў і затрымліваюць іх. Дрэнна камандуе дыспетчэрскі апарат аддзялення. Манеўровы парк станцыі Гомель не спраўляецца з работай.

Для практычнай дапамогі ў падрыхтоўцы да стаханаўскай дэкады і правядзення масава-палітычнай работы на месцы выязджае 15 чалавек каманднага складу і 20 палітработнікаў.

Новабеліцкія клієнтура, у прыватнасці завод «Везувій» і камбінат імя Гікало, для забеспячэння поспеху стаханаўскай дэкады ўпарадкоўвае пад'язныя шляхі, арганізоўвае работу па хутчэйшай пагрузцы і разгрузцы вагонаў. Не ўключылася яшчэ ў падрыхтоўчую работу гомельская клієнтура.

Аб падрыхтоўцы да стаханаўскай дэкады на менскім вузле паведаміў парторг вузла т. **Каждан.** На вузлу праведзены спецыяльзаваныя нарады рабочых, на якіх абмяркоўвалася адно пытанне, — што ім перашкаджае стаць стаханаўцамі. На гэтых нарадах выяснілася, што дзяжурны па станцыі пасажырскай т. **Каланіцкі** і начальнік таварнага двара т. **Каўшэвіч** не ствараюць умоў для пераходу рабочых на стахнаўска-крывасасўскія метады работы. Каўшэвіч быў адразу знят з работы і пераведзен на ніжэйшую пасаду, а Каланіцкі атрымаў папярэджанне. Па лініі партыйнай арганізацыі пастаўлена задача — дабіцца, каб усе члены і кандыдаты партыі былі стаханаўцамі і арганізатарамі стаханаўскага руху. Ужо ёсць тры партыйныя групы ў складзе 20 членаў і кандыдатаў партыі пялкам стаханаўскія. На вузле выходзіць 8 штодзенных насценгазет, якія асвятляюць ход падрыхтоўкі да стаханаўскай дэкады.

За апошні час адчуваецца некаторае паляпшэнне ў рабоце вузла.

Аднак, усё гэта не дае падставы самасупакойвацца. Падрыхтоўку да стаханаўскай дэкады трэба арганізаваць так, каб забяспечыць сапраўды большэвіцкае яе правядзенне.

Імя ордэнаносца акадэміка Т. Д. Лысенка, выдатнага аўтара яравізацыі, зараз шырока вядома па ўсяму Совецкаму Саюзу. Кіруемы ім селекцыйны навукова-даследчы інстытут, які працуе над новай методыкай насенняводства над выкарыстаннем новых гатункаў пшаніцы, бабаўняніка і іншых культур, зараз моцна звязан з тысячамі калгаснікаў-вопытнікаў і хатамі-лабараторыямі, якія сталі энтузіястамі яравізацыі.

Яравізацыя зярновых культур буйна разгортваецца па ўсёй нашай краіне. Калі яравізіраваны пасеў па Саюзу ў 1935 г. быў праведзен на плошчы 2,100 тыс. гектараў, то зараз ужо складзен план севу 1936 г. на 4.900 тыс. гектараў.

Адэскі інстытут за 2½ года, замест 10—12 год, вывеў шляхам скрыжавання новы гатунак яравой пшаніцы. НА ЗДЫМКУ: работа па выкарыстанню новых гатункаў пшаніцы ў цяпліцы адэскага інстытута селекцыі акадэміка Т. Д. Лысенка. Ізаляцыя расліны пасля скрыжавання (штучнае апыленне), за работай лабаранта тав. Сквірская.

Фота ВЕЛІКЖАНІНА (Совфото)

ПАСЛЯ РАЗРЫВУ ГЕРМАНІЯЙ ЛАКАРНІСКАГА ДАГАВОРУ

13 сакавіка—сесія Совета Лігі нацый

ЖЭНЕВА, 9 сакавіка. (БЕЛТА). Германскі ўрад запрошан прыняць удзел у надыходзячай надзвычайнай сесіі Совета Лігі нацый у наступнай форме: генеральны сакратар Лігі перадаў па тэлеграфу германскаму ўраду поўны тэкст французскай скаргі, затым ён паведаміў у сваёй тэлеграме, што старшыня Совета Лігі нацый назначыў пасяджэнне на 13 сакавіка. Далей у тэлеграме гаворыцца: «Калі германскі ўрад, як бок, падпісаўшы памянёныя ва французскай ноце абавязацельствы, захацеў-бы прыняць удзел у разглядзе гэтага пытання Советам, я быў-бы ўдзячан, калі-б вы мяне аб гэтым паведамілі».

Апублікавана павестка надзвычайнай сесіі Совета Лігі, назначанай на 13 сакавіка.

1. Прыняцце парадку дня.
2. Дагавор аб узаемнай гарантыі паміж Германіяй, Бельгіяй, Францыяй, Вялікабрытаніяй, Італіяй, падпісаны ў Лакарно 16 кастрычніка 1925 г. (паведамленне французскага і бельгійскага ўрадаў).

ВОДГУКІ СУСВЕТНАГА ДРУКУ

Францыя

Плады палітыкі ілюзій

ПАРЫЖ, 9 сакавіка. Генерал Касцельно піша ў газеце «Эко дэ Пары» (орган французскага генштаба):

«Палітыка ілюзій, слабасці і саступленняў, якая праводзілася на працягу 10 год у адносінах да Германіі, дае сёння горкія плады, якія мы заўсёды прадбачылі. Занавес падымаецца, і мы бачым, што Германія намерана навязаць сваю волю Еўропе, калі не ўсяму свету. Гісторыя пачынаецца спачатку. Яна вучыць нас, што Германія заўсёды прабавала дабіцца сваіх палітычных мэт з дапамогай зброі, калі яна мэтпа дабівацца іх іншымі спосабамі, не прыбягаючы к сіле. Яна не мяняе сваіх метадаў».

Вядомы журналіст Сен-Брыс піша ў «Журналь»: «Германія яшчэ раз кідае выклік усяму свету. Паспешнасць Гітлера, які прабуе манеўраваць паміж Лонданам, Парыжам і Рымам, можа паслужыць повадам для неабходнага аднаўлення блока, зацікаўленага ў парадку. Францыя і Бельгія маюць права разглядаць дзеянні Гітлера, як акт агрэсіі, і звярнуцца да дзяржаў-гарантаў.

Румынія

Трывожныя настроі ў Бухарэсце

ВЕНА, 9 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва «Тэлеграфен кампані» у паведамленні з Бухарэста адзначае, што прамова Гітлера і ўступленне германскай арміі ў дэмілітарызаваную зону Рэйнскай вобласці выклікала ў Бухарэсце вялікае ўзбуджэнне. Пад старшынствам румынскага караля адбудзецца пасяджэнне вышэйшага ваеннага совета з удзелам усіх былых прэм'ераў і ўсіх камандуючых карпусамі армій. Ваенны совет, паводле вестак агенцтва, абмяркуе пытанні аб становішчы ўзброеных сіл Румыніі, а таксама аб паскарэнні рэалізацыі зробленых за Францыі ваенных заказаў.

Бельгія

Вялікае ўзбуджэнне ў Бруселі

ПАРЫЖ, 9 сакавіка. Разрыў Германіяй лакарнскага дагавору выклікаў велізарнейшае ўзбуджэнне ў Бруселі. Газета «Насьон бельж» указвае, што

«ваенная акупацыя левага берага Рэйна Германіяй знішчае самую буйную гарантыю, дадзеную версальскім дагаворам заходнім дзяржавам. З гэтага часу ўсяго некалькі кілометраў будуць аддзяляць Льеж і Мец ад ачага пагрозы. Яшчэ ўчора дэмілітарызацыя Рэйнскай вобласці ставала перашкоду паўтарэнню 1914 года, давала адтэрміноўку тым, хто спрабуе апасацца гэтага паўтарэння. На працягу некалькіх гадзін гэты апошні фактар бязпаснасціператворан ў нішто. Круг завершэн».

Аўстрыя

Кельга давяраць запэўненням Гітлера

ВЕНА, 9 сакавіка. Учарашняя прамова Гітлера ў рэйхстагу выклікала ў аўстрыйскіх палітычных колах нездавальненне ў выніку таго, што ў гэтай прамове зусім не было ўпамянута аб адносінах Германіі к Аўстрыі. Газета «Нейесвінер тагблат» па гэтаму поводу піша:

«Гітлер прачытаў цэлы каталаг мірных прапаноў і запэўненняў, але зусім не краноўся пры гэтым нас, аўстрыйцаў, не гледзячы на тое, што для нас самым важным з'яўляецца імённа захаванне недатыкальнасці Аўстрыі».

Рад венскіх газет заяўляе, што выказванні Гітлера не шчырыя, што Гітлер, як, указвае газета «Нейес вінер тагблат», скарыстаў адсутнасць аднадушша паміж дзяржавамі — удзельнікамі лакарнскага дагавору ў пытаннні аб італа-абісінскім канфлікце, каб парваць лакарнскі дагавор, і ў якасці праллога выкарыстаў заключэнне франка-совецкага дагавору.

ДЗЕНЬ 8 САКАВІКА ЗА ГРАНІЦАЙ

Бурная антыяпонская дэманстрацыя ў Шанхаі

ШАНХАЙ, 9 сакавіка. (БЕЛТА). Учора ў сувязі з Міжнародным жаночым днём адбыўся мітынг, у якім прымала ўдзел каля 500 жанчын—прадстаўнікоў 7 буйнейшых жаночых арганізацый Шанхая і студэнтак. З рэзка антыяпонскай прамовай выступіла жонка забітага ў Кантоне ў 1925 г. Ляо Чжункай, саратніка Сун Ят-сена.

Прынята рэзалюцыя аб далучэнні ўсіх жаночых арганізацый, прадстаўнікі якіх прысутнічалі на мітынгу, да асацыяцыі нацыянальнага выратавання. Затым адбылася антыяпонская дэманстрацыя. Дэманстрацыя беспарашкодна пранікла на тэрыторыю французскай канцэсіі. Дэманстранты агалашалі лозунгі: «Далоў японскі імперыялізм», «Далоў здраднікаў», рэспаўсюджваючы тысячы лятучак і карт з адзначанымі раёнамі Кітая, якія захвачаны Японіяй.

Ля жалезных варот кітайскай часткі горада Наньдао дэманстрацыя была раптоўна атакавана французскай паліцыяй, якая прабавала вырваць плакаты і лозунгі з рук дэманстрантаў і збіла 8 студэнтаў. Спроба рассеяць дэманстрацыю не ўдалася. Усю працэсію пасля схваткі з паліцыяй узначаліў ранены студэнт з залітым крывёю тварам і вопраткай, з акрываўленай павязкай, якога везлі на рыкшы яго таварышы.

Дэманстрацыя рушыла па самых густа населеных беднякамі кутках кітайскага горада, выкрыкваючы лозунгі: «Уставай народ» «Усе да нас!» і т. д. Дайшоўшы да раёна Зікавей, дэманстрацыя ператварылася ў магутнае шэсце не менш 10 тыс. чалавек. Мясцамі раздаваўся спеў «Інтэрнацыянала», воклічы «Рот фронт» і антыяпонскія лозунгі.

Грандыёзны мітынг у Мадрыдзе

ПАРЫЖ, 9 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыда (Іспанія), учора ў азнаменаванне Міжнароднага жаночага дня народны фронт арганізаваў грандыёзны мітынг, на якім прысутнічала каля 100 тыс. чалавек. Мітынг прайшоў з велізарным уздымам.

Выступілі з яркімі прамовамі камуністка-дэпутат картэсаў (парламента) Далорэс Ібаруры, сацыялістка Альварэс і інш. Пасля мітынга адбылася дэманстрацыя.

НОВЫ УРАД У ЯПОНІІ

ХІРОТА — ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР

ТОКІО, 9 сакавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва «Домей цусін», у перагаворах паміж Хірота, з аднаго боку, і Тэрауці і Нагано — з другога, дасягнута поўная дагаворанасць аб складзе новага габінета.

***

ТОКІО, 9 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва «Домей цусін» паведамляе, што Хірота, склаўшы спіс габінета, наведаў прадстаўнікоў партый Мацюда (мінсейто) і Судзукі (сейюкай). Забяспечыўшы іх падтрымканне новаму габінету, Хірота, паводле слоў агенцтва, накіраваўся ў палац для падрыхтоўкі афіцыяльнага назначэння габінета.

***

ТОКІО, 9 сакавіка. (БЕЛТА). Габінет Хірота сфармаван у наступным складзе: прэм'ер, выконваючы адначасова абавязкі міністра замежных спраў — **Хірота** (міністр замежных спраў у габінеце Окада, у мінулым японскі пасол у СССР).

Міністр унутраных спраў і часова па сумяшчальнасці міністр асветы — **Усіо** (у 1928—1931 гг. займаў пост віцэ-міністра ўнутраных спраў.

Міністр фінансаў **Баба** (старшыня ідпатэчнага банка. Член верхняй палаты. Адзін з віднейшых прадстаўнікоў фінансавага капітала, вядомы як прыхільнік павелічэння ўзбраенняў).

Ваенны міністр — генерал **Тэрауці** (член вышэйшага ваеннага совета. Да снежня 1935 г. камандуючы войскамі на Фармозе. Цесна звязан з прыдворнымі коламі).

Морскі міністр — адмірал **Нагано** (узначальваў японскую дэлегацыю на лонданскай морскай канферэнцыі).

Былы морскі міністр Осумі назначан членам вышэйшага ваеннага совета. Аб новым назначэнні былога ваеннага міністра Кавасіма пакуль вестак няма. Чакаецца, што ён будзе пераведзен у рэзерв.

ВЕЧАР ПАМЯЦІ Д. ФУРМАНАВА

Праўленне саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і ўсебеларускі радыёкамітэт арганізуюць 15 сакавіка ў радыётэатры (клуб імя Сталіна) вялікі літаратурна-музычны вечар, прысвечаны 10-годдзю са дня смерці пісьменніка Д. Фурманава. Уступнае слова аб творчасці пісьменніка скажа праф. Бранштэйн. З успамінамі выступяць баявыя таварышы Фурманава. Будуць прачытаны ўрыўкі яго твораў. Народныя паэты рэспублікі Янка Купала і Якуб Колас, паэты Александровіч, Броўка, Глебка, Харык, Аксельрод і інш. прачытаюць свае творы на абарончыя тэмы У праграме музычнай часткі — чырвонаармейская самадзейнасць, а таксама выкананне песень з фільма «Чапаеў» і інш. песень, прысвечаных Чапаеву. Выступленні будуць трансляваца па радыё.

ТВОРЫ КЛАСІКАЎ СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА МОВАХ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ МЕНШАСЦЕЙ

У выданні Дзяржаўнага выдавецтва БССР вышаў на мовах нацыянальных меншасцей рад твораў класікаў сусветнай літаратуры. З друку вышлі на яўрэйскай мове творы Шэкспіра «Гамлет», «Ромео і Джульета», «Юлій Цэзар» і «Атэла», Шылера — «Вільгельм Тэль», Лермантава — выбраныя вершы і паэмы ў перакладзе яўрэйскага совецкага паэта Хашчэвацкага. Пераклад Шэкспіра зроблен з Кембрыджскага акадэмічнага англійскага выдання На яўрэйскай мове ў бягучым годзе выдаецца «Германія» Гейнэ.

На польскай мове вышла паэма Пушкіна «Домік у Каломне» ў перакладзе польскага совецкага паэта Стандэ. У бягучым-жа годзе на польскай мове выпускаюцца выбраныя творы Пушкіна і Адама Міцкевіча.

ЛЕКЦЫІ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў МАСКВЕ І ЛЕНІНГРАДЗЕ

Ленінградскі універсітэт запрасіў акадэміка Шчарбакова прачытаць на гістарычным факультэце рад лекцый па гісторыі Беларусі. З сакавіка акадэмік Шчарбакоў зрабіў у інстытуце гісторыі Усесаюзнай Акадэміі навук у Маскве даклад па гісторыі Беларусі для выкладчыкаў гісторыі ў вышэйшых навучальных установах і сярэдніх школах. Гэтымі днямі акадэмік Шчарбакоў выехаў у Маскву для прачытання лекцый у гэтым-жа інстытуце на тэму «Паўстанні 1830-31 гадоў і 1863 г. на Беларусі».

Газетныя радкі

ЦЫРУЛЬНІ Ў КАЛГАСАХ

Ва ўсіх калгасах Ч.-Слабодскага сельсовета, Барысаўскага раёна, адкрыты цырульні. Лепшыя цырульні абсталяваны ў калгасах «Чырвоная Трасцяніца», «Чырвоная зорка» і імя АДПУ. (**«Большэвік Барысаў шчыны»**).

ДОМ ДЛЯ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У РАЁНЕ

У м. Дрыса пабудаван дом для спецыялістаў. У доме будзе шэсць кватэр. (**«Большэвік Полаччыны»**).

Кадр з фільма «Мы з Кранштата»

БАДАН

Бадан — травяністая шматгадовая расліна з сям'і камнеломкавых, уяўляе сабой каштоўную тэхнічную сыравіну.

За апошні час бадан высунуўся наперад, як расліна, якая можа быць шырока выкарыстана для азеляненння гарадоў і пасёлкаў. У даным выпадку бадан прадстаўляе каштоўнасць дзякуючы наступным якасцям: буйнае, трывалае, вечназялёнае лісце, якое набывае ўвосень чырвонаватае адценне, вельмі ранняе, прыкладна ў пачатку мая, і багатае цвіценне, буйныя прыгожыя кветкі, устойлівасць супроць шкоднікаў і непаядаемасць жывёлай. Лёгкая і хуткая прыжываемасць пры перасадцы і вялікая ценевынослівасць даюць магчымасць разводзіць бадан пад палогам дрэваў у лесе.

Бадан — расліна суровых кліматычных умоў. Вобласць натуральнага яго распаўсюджання досыць вялікая. Бадан сустракаецца на Алтаі, Саянах, у горах Прыбайкалля і Забайкалля і ў Паўночнай Манголіі, дзе ён мясцамі стварае суцэльныя зараслі. Зіму ён пераносіць вельмі добра і нілкіх маразоў не баіцца.

Вырошчванне баданаў у БССР у поўнай меры магчыма. Яна часткова пачалася закладкай невялікай плантацыі ў Магілеўскім лесгасмагазе ў 1934 г. на плошчы да 1 гектара. У плане веснавых лесакультурных работ 1936 г. трэст Лесбел прадугледжвае пашырэнне асноўнай плантацыі і пасеваў насення пад палогам лясных дрэвастояў на плошчы да 50 гектараў.

Інжынер ПЛЕНІН.

СКАРЫСТАННЕ МЯЗГІ

Кожны год на крухмальных заводах БССР ад перапрацоўкі бульбы застаецца нескарыстанымі больш 100 тыс. тон адыходаў, так званай мязгі. Крухмальны завод «Чырвоны Бераг», Жлобінскага раёна, рашыў скарыстаць гэтыя адыходы. Для гэтай мэты на заводзе быў устаноўлен прэс сістэмы «Яна», які за гадзіну адціскае да 4 тон мязгі. Адціснутая мязга мае ў сваім складзе 14 проц. крухмалу, бульба-ж мае 18—19 проц. крухмалу. Такая мязга з'яўляецца добрым кормам для жывёлы і яна прыгодна для выпрацоўкі на броварах спірту.

Скарыстанне ўсёй мязгі на крухмальных заводах БССР заменіць сабой звыш 21 тыс. тон бульбы. Да пачатку сезона 1936—37 года на крухмальных заводах БССР будзе ўстаноўлена 6 прэсаў «Яна».

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

«ЖАНГЛЁРЫ З ГАЗЕТЫ «РАБОЧИЙ»

Пад такім загалоўкам у нумары «Звязды» ад 6 сакавіка быў змешчан матэрыял аб тым, што газета «Рабочий» у інфармацыі аб стаханаўскім двухдакадніку на заводзе імя Кірава дала няправільныя лічбы выканання плана па цэхах.

Рэдакцыя газеты «Рабочий» прызнала ўказанні «Звязды» правільнымі і налажыла адміністрацыйнае спагнанне на работніка прамысловага аддзела рэдакцыі тав. Клепко, якая здала ўказаную інфармацыю.

РЭГБІ

У нас пачалі іграць у рэгбі зусім нядаўна. Першая міжгародняя сустрэча ў СССР адбылася ўвосень 1935 года ў Менску.

Першыя поспехі совецкага спорта па рэгбі прыцягнулі ўвагу за граніцай. Жаданне сустрэцца з совецкімі рэгбістамі выказаў «Рэсінг-клуб». У гэтым годзе міжнародная сустрэчы з рабочымі камандамі Францыі. Буржуазная газета «Пары Суар» змясціла інтэрв'ю з наведаўшым Францыю старшынёй маскоўскай секцыі рэгбі тав. Жан Но аб развіцці рэгбі ў СССР.

У 1936 годзе гэта ігра набудзе вялікі размах. У Маскве ўжо трэніруюцца 36 каманд, арганізуюцца каманды ў Кіеве, Харкаве і іншых гарадах Саюза. У Тфлісе адкрыецца ўсесаюзная школа па рэгбі.

У Менску ў гэтым годзе будуць арганізаваны 8 каманд (даве гарадскія, па дзве каманды арганізуюць таварыствы «Дынамо» і «Лакаматыў» і па адной камандзе тэхнікум фізкультуры і таварыства «Спартак»)

У гэтым годзе менскія рэгбісты сустрэнуцца з рэгбістамі Кіева, Харкава і Масквы. Трэніраваць усе менскія каманды будзе член усесаюзнай секцыі рэгбі Жорж Політ. Трэніроўка пачнецца ў бліжэйшы час ў манежы, а з паляпшэннем надвор'я—у полі. Тав. Політ правядзе таксама семінар для падрыхтоўкі трэнераў рэгбі. ВСФК БССР яшчэ скептычна адносіцца да рэгбі, не папулярызуе гэту ігру і зусім не садзейнічае тав. Політу ў яго рабоце.

65-ГОДДЗЕ ПАРЫЖСКАЙ КОМУНЫ

18 сакавіка г. г. спаўняецца 65-годдзе Парыжскай комуны. ЦК МОПР БССР намеціў рад мерапрыемстваў па азначэнню гэтай знамянальнай даты. 17 і 18 сакавіка ў гарадах і раённых цэнтрах рэспублікі адбудуцца ўрачыстыя інтэрнацыянальныя вечары з удзелам партыйных, совецкіх і прафесіянальных арганізацый сумесна з мопраўскім актывам. У школах будуць праведзены раніпнікі.

На прадпрыемствах пачалося правядзенне гутарак і дакладаў аб Парыжскай комуне. Рад фабрык і заводаў рыхтуюць падарункі інтэрнацыянальным дзіцячым дамам.

На святкаванне 65-годдзя Парыжскай комуны ў Менск прыязджаюць тт. Бокань (венгерская секцыя МОПР), Джонс (амерыканская секцыя) і Розэн (Латынская Амерыка).

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЛЁТ ВЫДАТНІКАЎ ДЗЯРЖБАНКА

9 сакавіка ў памяшканні Белдзяржтэатра ў Менску адкрыўся ўсебеларускі злёт выдатнікаў дзяржаўнага банка. Даклад аб рабоце банка і задачах банкаўскіх работнікаў у 1936 годзе ўчора зрабіў кіраўнік Беларускай канторы Дзяржаўнага банка т. Галятоўскі. На злёце прысутнічае 97 выдатнікаў. Сёння злёт заканчвае сваю работу.

ПАСЛЯ ТРЭЦЯГА ТУРА

Учора на ўсебеларускім жаночым шахматна-шашачным турніры іграўся трэці тур. На першым месцы ідзе шахматыстка Бабруйска тав. Сілінг, якая мае тры ачкі з трох. Партыя паміж стаханаўкай менскай фабрыкі «Кім» тав. Шапіра і гомельчанкай Ільіной адкладзена ў выйгрышным для першай становішчы.

Па шашках на першым месцы тав. Зісерсон (Менск) і Зелівянская (Магілеў).

Коратка

(Ад карэспандэнтаў «Звязды» і Белта)

* **Рэчны вакзал** абсталёўваецца ў Лоеве. Каля будзе мець залу для пасажыраў, пакой мацеры і дзіцяці, цырульню, буфет, камеру для хаванння ручнога багажа.

* **Выстаўка зімовых фасонаў гатовага адзення** адкрываецца сёння ў актавай залі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Экспанаты прадставілі лабараторыя Белшвэйтрэста і рад яго фабрык.

* **Праект рэканструкцыі менскага варштатабудаўнічага завода імя Вашылава** распрацаван праектным бюро Баўманскага машынабудаўнічага інстытута ў Маскве. Кошт рэканструкцыі вызначаецца ў 5.100 тыс. руб. Праект прадугледжвае павелічэнне выпуску прадукцыі заводам да 12.014 тыс. руб. у год.

* **Фільм «Дуброўскі»** па А. С. Пушкіну, які дэманструецца ў кіно-тэатры «Чырвоная зорка» ў Менску, карыстаецца вялікім поспехам. Паступаюць шматлікія калектыўныя заяўкі на прагляд фільма ад школ, прадпрыемстваў і чырвонаармейскіх часцей.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Першы Беларускі дзяржаўны тэатр БДТ-1 — 11 сакавіка ПЛАТОН КРЭЧЭТ Пачатак у 8 г. веч. Білеты—у касе тэатра.

Гукавы кінотэатр «Чырвоная зорка». Гукавы мастацкі фільм „ДУБРОВСКИЙ“

Гукавы кінотэатр „ПРОЛЕТАРЫЙ“ Мастацкі гукавы фільм „ПА СЛЯДАХ ГЕРОЯ“

Гукавы кінотэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» Гукавы замежны фільм ПАД ДАХАМІ ПАРЫЖА

Кіно «СПАРТАК» Выдатны ўсходні фільм НАМУС (Честь)

Менскай саматужна-прамысловай арцелі «ПОБЕДА»

ПАТРЭБНЫ

для пастаяннай работы ў арцелі:

ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР,
НАМЕСНІК ГАЛОЎНАГА БУХГАЛТАРА,
МАЙСТАР-ЦУКЕРШЧЫК,
ЗАГ. СКЛАДАМ,
ЧОРНАРАБОЧЫЯ,
ВОЗЧЫКІ І СТОРАЖ.

АРЦЕЛЬ ПРАДАЕ грабавы круглы лес, яблычнае цеста, штучны мёд, уксус і рознакаляровую цукровую калёру (шчэрбет).

Зварачацца па адрасу: Менск, Ракаўская, 26, тэл. 21-583, арцель «Победа».

Патрэбен пакой. Аплата па згодзе. Зварачацца: Совецкая, 63, рэдакцыя «Звязды», 3-ці паверх, пакой № 6, да т. Папялкоўскага з 11 да 4 гадз. дня.

Прэзідыум цэнтральнага совета прафсаюзаў Беларусі СКЛІКАЕ сёння, 11 сакавіка, у 7 гадзін вечара, у памяшканні ЦСПСБ (пакой № 14, 2-гі паверх) НАРАДУ СТАРШЫНЬ ФЗМК гор. Менска ПА ПЫТАННЮ аб падрыхтоўцы да абмену профбілетаў.

На нарадзе абавязкова павінны прымаць удзел апрача старшынь ФЗМК старшыні ЦП, ЦК саюзаў і ўпаўнаважаныя ЦК саюзаў.

Прэзідыум ЦСПСБ.

На аснове пастановы ЦВК і СНК СССР ад 9 лістапада 1934 года і пастановы СНК СССР ад 25 кастрычніка 1934 г. за № 2455,

БЕЛАРУСКАЕ КІРАЎНІЦТВА МЕР і ВАГІ

абвяшчае, што УСЕ ВЫМЯРАЛЬНЫЯ ПРЫЛАДЫ, падлягаючыя паўторнай абавязковай праверцы і кляйменню,

якія знаходзяцца ва ўсіх прадпрыемствах і ўстановах гор. Менска і Менскага раёна,

павінны быць прадстаўлены ў кіраўніцтва мер і вагі (Правадная, 6) НЕ ПАЗНЕЙ 30 САКАВІКА.

Пасля ўказанага тэрміну вымяральныя прылады з пратэрмінаваным кляймом будуць лічыцца незаконнымі.

Уладальнікі вымяральных прыладаў, не прадставіўшыя іх к паўторнай праверцы і кляйменню да ўказанага тэрміну, будуць падвяргацца штрафу да 300 руб.

К паўторнай праверцы падлягаюць усе вымяральныя прылады, маючыя кляймо 1934 г. і больш ранніх галоў і наступныя прылады, маючыя кляймы 1935 г., як-то: вагі цыферблатныя, аўтаматычныя і поўаўтаматычныя і гіры да іх, рулеткі цесмяныя, малакомеры, скурамерныя машыны і планіметры, кантрольныя манометры, манометры рабочыя розных назначэнняў, мановакуумеры, вакуумеры, тэрмометры медыцынскія, тэрмометры ветарынарныя, тэрмометры інкубатарныя, пуркі.

БЕЛ. КІРАЎНІЦТВА МЕР І ВАГІ.

Універсітэт для стаханаўцаў пры Цэнтр. Доме тэхнікі. 12 САКАВІКА ЛЕКЦЫЯ доктара тэхнічных навук Шпенцэра — «Асновы хімічных ператварэнняў».

Лекцыя тав. Бранштэйна — «Мастацкая літаратура і социялістычнае будаўніцтва».

Дзём — ад 11 да 2 гада., вечарам — ад 7 да 10 гадз.

Уваход па пасведчаннях. Кандыдаты, залічаныя на дзённую змену, атрымліваюць пасведчанні ва універсітэце.

РЭКТАРАТ.

15 сакавіка, у 7 гадзін вечара, у памяшканні інстытута ЛІМ БелАН (рог Ленінскай і Кірава 29-35), пакой 33

АДБУДЗЕЦЦА

ПУБЛІЧНАЯ АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫІ

на вучоную ступень кандыдата літаратуразнаўчых навук навуковым работнікам інстытута Міхасём Грыгоравічам Ларчанка

НА ТЭМУ:

„ЛІРЫКА ЯКУБА КОЛАСА“.

Афіцыйны апанент акад. І. І. ЗАМОЦІН.

Дырэкцыя.

Беларуская рэспубліканская кантора

„САЮЗЗАГОТСКУР“

даводзіць да ведама здатчыкаў скурсыравіны, што часовыя квіткі, выданыя райзаготкантарамі «Саюззаготскур» на права атрымання тавараў за здаваную сыравіну, павінны быць прад'яўлены да 1 красавіка па месцу здачы сыравіны для атрымання прылічваючыхся тавараў.

Выданыя квіткі сапраўдны ДА 1 КРАСАВІКА 1936 г.

БЕЛАРУСКАЯ РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАНТОРА «САЮЗЗАГОТСКУР».

УКРАИНСКИЙ ЦЕНТРАЛЬНЫЙ ИНСТИТУТ ЭНДОКРИНОЛОГИИ и ОРГАНОТЕРАПИИ

Харьков ул. Пролетарская 16

ГЕМАТОГЕН ДЕТСКИЙ в пастилках и для ВЗРОСЛЫХ в драже-таблетках.

ПРИМЕНЯЕТСЯ ПРИ МАЛОКРОВИИ УПАДКЕ ПИТАНИЯ, ЯВЛЕНИЯХ ИСТОЩЕНИЯ РАХИТЕ и НАЧАЛЬНЫХ ФОРМАХ ТУБЕРКУЛЕЗА

ПРОДАЖА во всех аптеках и магазинах сангигиены СССР, а при отсутствии на местах высылается почтой

Тыраж 95955 экз. Друкарня газеты «Звязда» Менск, Совецкая, 63. Уп. Галоўлітбела № К—58.